ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б) МАБІЛІЗУЕ УСІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ І МАСТАКОЎ,

якія імкнуцца ўдзельнічаць у соцыялістычным будаўніцтве

на стварэньне Магнітабудаў літаратуры і мастацтва

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЦАНА АСОБНАГА НУМАРУ 5 КАП.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ФЭДЭРАЦЫІ АБ'ЯДНАНЬНЯЎ САВЕЦКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ І ГАЛОЎМАСТАЦТВА БССР

№ 8 1932 Менск 15 мая

Створым бальшавіцка-творчую атмасфэру ў літаратуры

У гістарычным рашэньні ад 23 красавіка 1932 г. ЦК УсеКП(б) пастанавіў:

1. Ліквідаваць асоцыяцыю пролетарскіх пісьменьнікаў (ВОАПП, РАПП).

2. Аб'яднаць усіх пісьменьнікаў, што падтрымліваюць плятформу савецкай улады і імкнуцца ўдзельнічаць у соцыялістычным будаўніцтве, у адзіны саюз савецкіх пісьменьнікаў з комуністычнай фракцыяй у ім.

3. Правесьці аналёгічныя зьмены па лініі іншых відаў мастацтва.

Гэтая пастанова, што мае выключнае політычнае значэньне, адкрывае новую, багатую самымі шырокімі магчымасьцямі і пэрспэктывамі, старонку ў гісторыі разьвіцьця і росту савецкай літаратуры і мастацтва, ставіць перад літаратурай і мастацтвам грандыёзныя і складанейшыя задачы і дае найлепшыя способы для іх вырашэньня. Гэтая пастанова шчыльна набліжае літаратуру і мастацтва да актуальнейшых задач нашай эпохі, шчыльна ўвязвае іх з нашым соцыялістычным будаўніцтвам, з яго генэральным плянам, у прыватнасьці—з задачамі другой пяцігодкі, указвае найлепшыя шляхі для савецкага пісьменьніка і мастака па актыўнаму ўдзелу ў стварэньні бясклясавага соцыялістычнага грамадзтва, па стварэньню сапраўдных магнітабудаў літаратуры і мастацтва.

Пастанова ставіць пытаньне пра новыя, больш шырокія формы і мэтоды работы літаратурна-мастацкіх організацый, формы і мэтоды, якія-б поўнасьцю забясьпечылі далейшы, яшчэ больш шпаркі рост літаратуры і мастацтва, якія-б поўнасьцю забясьпечылі сапраўднае творчае спаборніцтва паміж пісьменьнікамі і мастакамі. Не дэкляраціямі, ня пустымі лёзунгамі, ня голымі абяцаньнямі, не парадкай шуміхай, не знадворнай дзялацкай, а часам і зусім бяспрынцыпнай мітусьнёй, не абюрократычнымі размовамі пра мастацтва, ня гульнёй у літаратуру, ня кульгавым і бязідэёвым саматужніцтвам, ня плюгавым провінцыяльным аматарствам,—**а спаборніцтва сапраўднымі поўнакроўнымі мастацкімі творамі, якія-б па сваёй ідэёвай і мастацкай якасьці былі-б вартымі Магнітабудаў нашай індустрыі,** былі-б вартымі нашай эпохі, былі-б вартымі актыўнага і сьвядомага ўдзельніка нашага будаўніцтва.

Так расцэньваем мы гэтую выключную па свайму значэньню пастанову і так яе разумеем.

Як праяўляецца гэтая пастанова ў нашых беларускіх умовах і абставінах? Мы мелі ў нас адзіную пролетарскую літаратурную організацыю—Беларускую асоцыяцыю пролетарскіх пісьменьнікаў. Ці апраўдала яна сябе ў сваёй мінулай рабоце, ці была яна жыцьцёвай, ці прынесла яна што-небудзь ў актыў нашай беларускай пролетарскай культуры? Толькі вораг можа даць адмоўны адказ на гэтае пытаньне, можа ахаяць гэтую організацыю, зганьбаваць яе. БелАПП за невялікі параўнаўча час свайго існаваньня аб'яднала ўсе наяўныя пролетарскія літаратурныя сілы, пад кіраўніцтвам партыі няўхільна змагалася за лінію партыі ў літаратуры, у літаратурным руху, БелАПП выявіла і аб'яднала значныя маладыя літаратурныя кадры, правяла вялікую па свайму політычнаму значэньню і выніках работу па закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру. Уся дзейнасьць БелАПП, яе літаратурна-політычная работа праводзілася на аснове адзінай лініі партыі, на аснове барацьбы за гэтую генэральную лінію. Але гэта не азначае, што БелАПП не магла дапускаць тых ці іншых вялікіх і малых памылак, памылак якія сказваліся ў тых ці іншых конкрэтных мерапрыемствах, альбо паасобных устаноўках організацыі, альбо ў работах паасобных таварышоў. І БелАПП не хавала і не хавае сваіх памылак, выкрывала іх, выяўляла на суд пролетарскай грамадзкасьці. Гэтаму асабліва спрыяла шырока разгорнутая за апошнія часы творчая дыскусія ў організацыі. Праўда, трэба сказаць, што паасобныя памылкі часам ускрываліся і крытыкаваліся несваячасова, ня досыць рашуча, не заўсёды ва ўсёй паўнаце ставіліся пытаньні пра тыя ці іншыя хваравітыя зьявішчы ў організацыі, надзвычай марудна праводзілася перабудова організацыі ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі. Але, ня гледзячы на ўсе свае памылкі, БелАПП пад кіраўніцтвам партыі адыграла выключную ролю ў справе стварэньня і консолідацыі беларускай пролетарскай літаратуры, у барацьбе за яе ідэёвую і творчую гегемонію. Мы падкрэсьліваем гэты факт таму, што знаходзяцца яшчэ і такія «аматары», якія схільны расцэньваць пастанову ЦК УсеКП(б) як **удар** па воаппаўскіх літаратурных організацый, якія па думцы гэтых «аматаўроў» (дарэчы, людзей з пэўнай правай орыентацыяй) абсолютна нібы ня спраўляліся са сваімі задачамі. Зразумела, што такія думкі, такія настроі толькі шкодзяць савецкай літаратуры.

ЦК УсеКП(б) пастанавіў ліквідаваць ВОАПП таму, што «ў сучасны момант, калі пасьпелі ўжо вырасьці кадры пролетарскай літаратуры і мастацтва, вылучыліся новыя пісьменьнікі і мастакі з заводаў, фабрык, колгасаў, рамкі існуючых пролетарскіх літаратурна-мастацкіх організацый (ВОАПП, РАПП, РАМП ды інш.) становяцца ўжо вузкімі і тармозяць сур'ёзны размах мастацкай творчасьці. Гэтая акалічнасьць стварае небясьпеку ператварэньня гэтых організацый са сродкаў найбольшай мобілізацыі савецкіх пісьменьнікаў і мастакоў наваколл задача соцыялістычнага будаўніцтва ў сродак культываваньня гурткоўай замкнутасьці, адрыву ад політычных задач сучаснасьці і ад значных груп пісьменьнікаў і мастакоў, што спачуваюць соцыялістычнаму будаўніцтву. Адсюль неабходнасьць адпаведнай перабудовы літаратурна-мастацкіх організацый і пашырэньне базы іх работы».

Ці мелі мы ў БелАПП паказаную ў пастанове партыі небясьпеку? Мелі. Адзін з асноўных недахопаў у рабоце БелАПП—гэта нездавальняючая работа з пісьменьнікамі-спадарожнікамі, недастатковы ўплыў на іх, слабое прыцягненьне іх да актыўнага ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве. Гэтаму спрыялі старыя формы і мэтоды работы БелАПП, якія аджылі свой час. Структура організацыі ставіла організацыйныя бар'еры на шляху больш шчыльнага набліжэньня да БелАПП пісьменьнікаў-спадарожнікаў, перашкаджала ўплыву на іх, ставіла перашкоды ім на шляху актыўнай работы ў адзіным рэчышчы савецкай літаратуры. Мы мелі ў БелАПП чаяўныя элементы гуртковай замкнутасьці. У выніку цэлы шэраг нездаровых тэндэнцый і зьяў: праяўленьні групаўшчыны, пролетчванства, залішняе недавер'е да таго ці іншага пісьменьніка-спадарожніка, часам замест глыбокага крытычнага аналізу яго творчасьці грубое адміністрацыйнае дзёрганьне, замест таварыскай чулай дапамогі, наклейваньне ярлычкоў (якія, дарэчы, мяняліся часам вельмі часта, бадай з кожным новым радком пісьменьніка: сёньня ён спадарожнік левы, заўтра ён ледзь не патрапіў у саюзьнікі, а на заўтра зноў спадарожнікі ды ўжо з правым духам...). Усё гэта сказвалася і на адставаньні беларускай пролетарскай літаратуры ад агульных тэмпаў і ўзроўню соцыялістычнага будаўніцтва.

Сказанае лішні раз падцьвярджае правільнасьць і сваячасовасьць захадаў, паказаных у пастанове ЦК УсеКП(б).

Пастанова ставіць перад намі шэраг адказнейшых задач. Вялікая адказнасьць за ўвесь літаратурны фронт ускладаецца на комуністаў, што працуюць у літаратуры. Выстаўляемыя ў пастанове запатрабаваньні будуць для кожнага з нас вялікім экзаменам «на зрэласць» савецкага пісьменьніка эпохі будаўніцтва соцыялізму. Сама пастанова была, між іншым, для некаторых пісьменьнікаў свайго роду «папярэднім іспытам». Мы ўжо гаварылі пра некаторых «аматараў удараў». Трапляюцца яшчэ і своеасаблівыя «рэваншысты», якія спрабуюць, праўда, пакуль што па вугольлю, выступаць з такімі заявамі: «што-ж, білі мяне ў свой час за нацдэмаўшчыну, цяпер я з імі, з пролетмальчыкамі, расквітаюся, мы ім цяпер пакажам». «Надзеі», бязумоўна, звыш чым недарэчныя і дарэмныя. Усім «разгоншчыкам», «ударшчыкам», «рэваншыстам» ды інш. ня шкодзіць памятаць, што клясавая барацьба, у літаратуры ня зьнімаецца, што ўсякія клясава-варожыя выступленьні будуць самім жорсткім чынам пабіты, адкуль-бы яны, з якога боку, ці з правага, ці з «левага», ня ішлі. Дарэмна таксама спадзяюцца і тыя, хто думае аб будучым адзіным саюзе савецкіх пісьменьнікаў, як аб нейкім ноевым каўчэгу, які аб'ядная «ўсіх і ўся», які адкрые дзьверы для «чыстых і нячыстых». Пра ўмовы прыналежнасьці да саюзу зырасна гаворыць пастанова ЦК УсеКП(б), у прыватнасьці яе другі пункт. Разам з адпорам такім настроям і выкананьням трэба рашуча ўдарыць і па ўсякім дэмобілізацыйным настроям сярод паасобных таварышоў з БелАПП, настроям, якія паслабляюць бягучую штодзённую работу, перашкаджаюць рэорганізацыю літаратурнага руху.

Мы спыніліся толькі на політычным значэньні пастановы ЦК УсеКП(б). Пра практычныя мерапрыемствы, пра самыя формы і сыстэму будучага саюзу скажа сваё слова оргбюро ЦК УсеКП(б). Але гэта ня здымае з нас адказнасьці за правядзеньне шырокай падрыхтоўчай работы да рэорганізацыі літаратурнага руху і гэтую падрыхтоўчую работу трэба праводзіць больш шпаркімі тэмпамі.

Пастанова ЦК зьяўляецца яскравым паказальнікам вялікай чуласьці і давер'я партыі шырокім савецкім пісьменьнікам масам. Задача пісьменьнікаў—быць поўнасьцю на вышыні пастаўленых партыяй задач і як мага хутчэй іх выканаць. Гэта мы з поспехам правядзем, стварыўшы чулую, таварыскую, бальшавіцкі-творчую атмосфэру ў нашым літаратурным руху.

Міхась Лынькоў

Дасьцігнем нявіданых сусьветных посьпехаў

Гістарычная пастанова ЦК УсеКП(б) аб рэорганізацыі літаратурна-мастацкіх організацый мае нятолькі ўсесаюзнае, але і сусьветнае значэньне.

Калі ў галіне індустрыяльнага і сельска-гаспадарчага соцыялістычнага будаўніцтва краіна Саветаў пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі дасьцігла нябывалых і нячуваных посьпехаў на страх і зьдзіўленьне адміраючаму капіталістычнаму сьвету, то ў галіне літаратуры мастацтва гэтакіх посьпехаў і такога шпаркага разьвіцьця не адчувалася.

Новы напрамак, які надае пастанова ленінскага ЦК літаратурна-мастацкай справе, сьведчыць аб тым, што і ў гэтай галіне мы таксама дасьцігнем нявіданых сусьветных посьпехаў.

Вялікае давер'е, аказанае партыяй да савецкіх пісьменьнікаў, якія стаялі па-за пролетарскімі пісьменьніцкімі організацыямі, само сабой абавязвае іх апраўдаць гэта давер'е і тварыць рэчы, годныя нашае вялікае эпохі.

Янка Купала

Сымон Баранавых

Апраўдаць даверлівасьць

Пастанова ЦК Усе КП(б) аб перабудове літаратурных організацый—гістарычны дакумант. Гэты дакумант зьнішчае літаратурныя межы, дае магчымасьць вялікай работы на літаратурным полі ў змаганьні за соцыялізм.

Сумесная праца пісьменьнікаў, у адным цесным бальшавіцкім саюзе, павінна даць, больш глыбокія, больш ідэёва-мастацкія творы.

ЦК УсеКП(б) даверыла сумесную працу літаратурным організацыям і мы павінны гэтую даверлівасьць апраўдаць.

Пастанова ЦК выкліча новы творчы ўздым

Менавіта цяпер, калі пролетарская літаратура мае буйныя перамогі і калі асноўныя масы пісьменьнікаў павярнулі да ўдзелу ў практыцы соцыялістычнага будаўніцтва, пастанова ЦК УсеКП(б) пра перабудову літаратурна-мастацкіх організацый зьяўляецца гістарычнаю і творыць цэлую эпоху. Гэта, бясспрэчна, выкліча вялізны творчы ўздым і дасьць магчымасьць уключыцца ў вялікую літаратуру ўсім тым, хто сумленна хоча быць байцом за сацыялістычную будучыню.

Я. Скрыган

Новы гістарычны этап

Пастанова ЦК УсеКП(б) азначае новы гісторычны этап у разьвіцьці літаратуры нашае краіны.

Перш за ўсё пастанова—ёсьць дакумант, які сьведчыць пра вялізарнейшую ўважлівасьць, чуласьць і давер'е нашай партыі да масы савецкіх пісьменьнікаў. Гэта, зразумела, многаму абавязвае тых пісьменьнікаў, якія сапраўды творчасьцю жадаюць удзельнічаць у соцыялістычным будаўніцтве. На цяперашнім этапе нельга абмяжоўвацца дэклерацыяй, абяцаньнямі,—пісьменьнікі павінны рапартаваць партыі творамі вялізарнейшае ідэёвае і мастацкае вагі.

Гісторычны дакумант ЦК—вялізарнейшы стымул для творчае работы, творчае ініцыятывы мас савецкіх пісьменьнікаў. Трэба цяпер больш, як калі, бязьлітасным чынам адмятаць «літаратурных канцылярыстаў», якія да гэтага часу яшчэ даволі ўпэўнена такі «праяўлялі» сябе і ў нас, у БССР.

Мы маем вялікі рост пролетарскае літаратуры, але трэба сказаць адкрыта, што пролетарскія літаратурныя організацыі, і ВОАПП і ў прыватнасьці БелАПП, ня поўна ўлічылі, зразумелі той паварот савецкіх пісьменьнікаў да задач соцыялістычнага будаўніцтва, які адбыўся. БелАПП, напрыклад, далёка недастаткова цікавілася работай, творчымі шуканьнямі, «творчымі мукамі» пісьменьнікаў-саюзьнікаў, мала дапамагаў ім.

Літаратуру бяскласавага соцыялістычнага грамадзтва пролетарскія пісьменьнікі будуць будаваць разам з усёй масай савецкіх пісьменьнікаў.

І, нарэшце, пастанова ЦК ускладае вялізарнейшыя абавязкі на марксыцка ленінскую крытыку. Павінны быць адмецены тыя крытыкі, што любяць падсьцерагчы і ўдарыць «з-за вугла», заглушыць...

Зазвычай крытык і пісьменьнік непрымірымыя ворагі. А між тым яны павінны быць найлепшымі прыяцелямі... Калі крытык будзе ўлічваць складанасьць творчага процэсу, ведаць самым дакладным чынам «сакрэты» пісьменьніцкае ляборэторыі, дапамагаць яму (пісьменьніку) у вырашэньні тых проблем, якія хвалююць яго, ён тады заслужыў давер'е і любоў з боку пісьменьніка.

Змаганьне за ленінскі этап у літаратуры першачарговая задача крытыкі. Для нас ясна, што толькі ленінскае разуменьне літаратуры (якое і пакладзены ў аснову апошняе пастановы ЦК) дало гэты гістарычны найвялікшы па сіле і дзелавітасьці дакумант, які сапраўды ўлічвае складанасьць разьвіцьця нашае літаратуры, вызначае новыя буйнейшыя магчымасьці для яе росту.

Платон Галавач

Ал. Кучар

Дваццацігодзьдзе бальшавіцкай „Праўды“

Дзень друку 1932 г. адзначаецца нашай пролетарскай грамадзкасьцю, як дзень 20-ці-годзьдзя існаваньня і барацьбы бальшавіцкай «Праўды». Выказваючыся па поваду 10-годзьдзя «Праўды», Ленін у сваім артыкуле на гэту тэму асабліва падкрэсьліваў неразрыўную сувязь бальшавіцкай штодзеннай газэты з барацьбой бальшавізму за ажыцьцяўленьне задач пролетарскай рэволюцыі і соцыялізму. І калі азірнуцца на шлях «Праўды» за мінулае два дзесяткі год, то варта перш за ўсё адзначыць вялізарную барацьбу цэнтральнага органу бальшавіцкай партыі за ажыцьцяўленьне ідэй Маркса і Леніна, ажыцьцяўленьне гэтых ідэй на ўсіх ступенях барацьбы пролетарыяту і працоўных, пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі. Бальшавіцкая «Праўда» давала і штодзенна дае ўзоры партыйнай барацьбы, узоры ўмелага злучэньня высокай прынцыповасьці пытаньняў з «дробязнымі» пытаньнямі рэволюцыйных будняў, з конкрэтнымі практычнымі задачамі, высунутымі на парадак дню рэволюцыяй.

Дзень друку зьяўляецца днём бальшавіцкай партыйнай літаратуры, днём бальшавіцкага організуючага слова. Ленін ня раз паказаў на неабходнасьць правядзеньня ў жыцьцё прынцыпу партыйнай літаратуры. У сваім артыкуле «Партыйная організацыя і партыйная літаратура» пісаў: «Літаратура павінна стаць партыйнай... у процілегласьць буржуазнаму літаратурнаму кар'ерызму і індывідуалізму, «барскаму анархізму», соцыялістычны пролетарыят павінен высунуць прынцып ПАРТЫЙНАЙ ЛІТАРАТУРЫ, разьвіць гэты прынцып і правесьці яго ў жыцьцё ў як мага больш поўнай і цэльнай форме».

Гэтыя словы тав. Леніна павінны і зараз стаць перад намі як асноўны лезунг у справе далейшага разьвіцьця літаратуры Савецкага Саюзу, як часткі агульна-партыйнай справы, як неразрыўна зьвязаным з усім бальшавіцкім друкам. Пастанова гістарычнай важнасьці ЦК УсеКП(б) па пытаньнях перабудовы літаратурна-мастацкіх організацый яшчэ больш павінна мобілізаваць пісьменьніцкія кадры на ажыцьцяўленьне ленінскай устаноўкі аб бальшавіцкай партыйнасьці, на сталую сувязь з рэволюцыйнай практыкай пролетарыяту. А ў гэтай справе бальшавіцкая «Праўда», гэтак многа месца і ўвагі аддаючы пытаньням культурнай рэволюцыі і ў прыватнасьці разьвіцьцю літаратуры, зьяўляецца лепшым узорам для ўсёй нашай работы.

Разгортваньне бальшавіцкага друку ў СССР зьяўляецца яркім узорам існай пролетарскай дэмократыі, выяўленьне творчых сіл мас рабочых і працоўных, організацыі мас вакол творчых задач соцыялістычнай будоўлі, узорам колектыўнай агітацыі і колектыўнай організацыі мас за справу пролетарскай рэволюцыі. Гіганцкімі тэмпамі разгортваецца сетка газэт. Гэтая сетка к пачатку 1932 г. па СССР дасягнула 5.600 газэт, у 6 з паловай разоў больш усіх даваенных газэт; разавы тыраж газэт дасягнуў 35 млн. экзэмпляраў, павялічыў яго ў адносінах з даваеннай Расіяй у 10 раз. На мове працоўных усіх нацыянальнасьцяй Савецкага Саюзу выдаюцца газэты, кнігі, часопісы, чым і дасягаецца разгортваньне культурнай рэволюцыі сярод працоўных былых прыгнечаных нацыянальнасьцяй. Шпарка вырасьлі тыражы кніг, колькасьць выданьняў і г. д. Усё гэта сьведчыць аб вялізарным разгортваньні барацьбы за ажыцьцяўленьне культурнай рэволюцыі за ўцягненьне ў сьвядомае актыўнае жыцьцё шырокіх мас і працоўных, дзякуючы організуючаму бальшавіцкаму слову.

Дзень друку і 20-годзьдзе бальшавіцкай «Праўды» павінны мобілізаваць пісьменьніцкую масу спачуваючую соц. будаўніцтву, на ажыцьцяўленьне задач, высунутых партыяй перад савецкай літаратурай. Савецкі пісьменьнік таксама як і рабкор, рабочы-ударнік на сваім прадпрыемстве, зьяўляецца «камандзірам грамадзкай думкі». (Сталін). Але гэта ганаровае званьне павінна быць заваявана нястомнай работай над падняцьцем якасьці сваёй творчасьці, упартай работай па аваладаньню марксыцка-ленінскай тэорыяй, штодзенным удзелам у соцыялістычным будаўніцтве, у барацьбе з правым і «левым» опортунізмам, у барацьбе за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай політыкі і супроць усялякіх скажэньняў гэтай політыкі з боку вялікадзяржаўных шовіністаў, нацдэмократаў і нацопортуністаў розных колераў.

20-годзьдзе «Праўды» гэта веха, якая азначае вялізарную перамогу бальшавіцкай вострай зброі—друку—у барацьбе за чыстату ленінскіх ідэй, супроць контррэволюцыйнага трацкізму, супроць правага ўхілу. Наш друк, прысьвечаны пытаньням літаратуры і мастацтва, а таксама і ўся наша літаратура павінна вучыцца ў «Праўды» бальшавіцкай ваяўнічасьці і няпрымірымасьці да клясавага ворага і опортунізму, бальшавіцкай загартаванасьці ў барацьбе за ажыцьцяўленьне соцыялізму. Мы стаім на рубяжы завяршэньня першай пяцігодкі і рыхтуемся да другой пяцігодкі—пяцігодкі пабудовы соцыялізму ў нашай краіне і ліквідацыі клясаў, перамаганьняў рэштак капіталізму ў экономіцы і ў сьвядомасьці людзей. Гэтая задача вялізарнай важнасьці патрабуе ўдзесярыць энэргію і творчы энтузіязм у галіне культурнай рэволюцыі. Адсюль вынікаюць практычныя задачы для ўсяго літаратурнага фронту. Прадпасылкай ажыцьцяўленьня якога і зьяўляецца гістарычнае рашэньне ЦК аб ліквідацыі РАПП і ВОАПП і стварэньне саюзу савецкіх пісьменьнікаў. Ідучы няўхільна па дырэктывах партыі, кіруючыся ўказаньнямі «Праўды», літаратурны фронт павінен у дзень друку і 20-годзьдзя «Праўды» яшчэ з большай сілай падкрэсьліць гэтыя асноўныя задачы і рушыць няўхільна наперад па шляху стварэньня магнітабудаў літаратуры.

Няхай жыве ленінская «Праўда»!

Няхай жыве ленінская партыя—організатар бальшавіцкага друку—і яе правадыр, тав. Сталін!

Прывітаньне ЦК УсеКП(б)

Агульны сход беларускіх, яўрэйскіх, польскіх, літоўскіх савецкіх пісьменьнікаў г. Менску пасылае шчырае прывітаньне кіраўніку і організатару соцыялістычнага будаўніцтва—ЦК УсеКП(б) і стойкаму бальшавіку-ленінцу і праваднру сусьветнага пролетарыяту тав. СТАЛІНУ.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб перабудове літаратурна-мастацкіх організацый зьяўляецца вялікім стымулам новага ўздыму творчай актыўнасьці савецкіх пісьменьнікаў.

Мы заяўляем [illegible] ЦК, што савецкія пісьменьнікі Савецкай Беларусі яшчэ больш узмоцняць барацьбу за поўнацэнныя глыбокія творы, вартыя нашай эпохі, эпохі пабудовы соцыялістычнага грамадзтва, за пабудову соцыялістычнай бацькаўшчыны сусьветнага пролетарыяту.

Няхай жыве ЦК УсеКП(б), няхай жыве т. СТАЛІН!

Стойкаму бальшавіку—прывітаньне!

Агульны сход савецкіх пісьменьнікаў гораду Менску шчыра вітаюць Міколу Мацьвеевіча Галадзеда, стойкага бальшавіка, адданага змагара за генэральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную політыку ў пяцігодзьдзе яго работы Старшынёй СНК БССР.

Посьпехі ленінскай культурнай рэволюцыі, посьпехі нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР самым шчыльным чынам зьвязаны з імем Міколы Мацьвеевіча Галадзеда.

Мікола Мацьвеевіч заўсёды пільна, уважліва і чула адносіўся і сачыў за разьвіцьцём літаратурнае справы ў нашай рэспубліцы, за ростам пролетарскай літаратуры, за ростам кадраў пролетарскай літаратуры з фабрык і заводаў.

Выступленьні М. М. Галадзеда па пытаньнях літаратуры, яго ўказаньні, парады, давалі нам, савецкім пісьменьнікам, заўсёды бальшавіцкую, партыйную орыентацыю ў змаганьні за літаратуру, соцыялістычную зьместам і нацыянальную формай.

Шчыра вітаючы Міколу Мацьвеевіча Галадзеда ад імя літаратурнага савецкага фронту БССР, жадаем яму далейшых посьпехаў у рабоце, на якую яго паставіла партыя і рабочая кляса.

ПРЭЗЫДЫУМ СХОДУ: Я. Колас, М. Лынькоў, Я. Купала, А. Александровіч, К. Крапіва, П. Швэйдэль, П. Галавач, Ц. Гартны, В. Вольскі, І. Харык, М. Чарот, М. Кульбак, Л. Кацовіч, Модэль, І. Шапавалаў.

Рэд. газ. «Літ. і Мастацтва».

За літаратуру, вартую эпохі...

Агульны недахоп існаваўшых да гэтага часу літаратурна-мастацкіх організацый заключаўся ў іх адставаньні ад пераможнага ходу жыцьця, накіраванага жалезнаю воляй Ленінскага ЦК на стварэньне новай гісторычнай эпохі, новай соцыялістычнай грамады.

Існаваўшы дагэтуль стан організацыйных форм мастацкай літаратуры, адыграўшы сваю дадатную ролю ў справе канцэнтрацыі пролетарскіх пісьменьніцкіх кадраў, ня могуць задаволіць тых патрэб, якія прад'яўляе пісьменьніку само жыцьцё. Тым-жа часам вялізарныя пэрспэктывы другой пяцігодкі ставяць яшчэ больш шырокія, болей адказныя задачы перад савецкай літаратурай. Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 23-IV-32 г. аб перабудове літаратурна-мастацкіх організацый мае гістарычнае значэньне і становіць сабою новы этап у літаратурным жыцьці. З другога боку гэта пастанова сьведчыць і пра шырокае давер'е комуністычнай партыі да беспартыйнай часьці пісьменьнікаў, якія шчыра імкнуцца прыняць удзел у соцыялістычным будаўніцтве. А таму моральны абавязак кожнага савецкага пісьменьніка — апраўдаць давер'е партыі сваёй практычнаю высока-мастацкай работай пад лёзунгам: «за соцыялістычную літаратуру, за літаратуру, сапраўды вартую вялікай эпохі і дастойную клясы, якая ажыцьцяўляе стварэньне новай бясклясавай грамады».

Якуб Колас

Песьня, далей па пяцігодцы!

У пройдзеным шляху—вялікія намажэньні сілы і вопыту, тэорыя і практыка, змаганьне з ворагам і еднасьць будаўнікоў бальшавіцкага мастацтва.

Надышоў час поўнага выкарыстаньня здабытага.

Наперадзе—неаглядная поле творчасьці. Пабудова сёнешняга, падмурак заўтрашняму. Работа поўная клясавай пільнасьці, насычаная змаганьнем супроць варожага.

Савецкая літаратура БССР павінна ўстаць на ўвесь свой рост, загаварыць на ўвесь голас.

Рэспубліка згаладала бяз добрай кнігі. Мы жывём у коле вялікіх тэм. Яны высьпяваюць у сьвядомасьці. Цяпер пачынаецца рэалізацыя.

Крытыка павінна расьці разам з пісьменьнікам. Ёй трэба навучыцца гаварыць пра галоўнае.

Чырвонаармеец штодзень чысьціць вінтоўку. Так-жа дбайна мы павінны ставіцца да свае зброі.

Наша слова не павінна ржавець. Адданае на службу соцыялістычнаму будаўніцтву яно павінна дайсьці ў парты комунізму.

Атрад падпарадкаванага мне слова ў дзеяньні.

Ён не адступіць ні воднага кроку з позыцый, здабытых у хадзе наперад, да пролетарыяту.

Песьня, далей па пяцігодцы!

Максім Лужанін

М. Кульбак

Пастанова ЦК робіць яшчэ больш яскравымі баявыя позыцыі ў літаратуры

Што датычыцца нашай БелАПП, я павінен падкрэсьліць, што ёсьць прыметы розных рэванш-настрояў. Бяз усякага сумненьня, што БелАПП шмат зрабіла ў перабудове, у перавыхаваньні пісьменьнікаў у нас, у БССР. Трэба аднак з другога боку зьвярнуць увагу на тое, што некаторыя літаратурныя працаўнікі ставяць нацiск на той пункт у пастанове, дзе гаворыцца аб заслугах пролетарскіх пісьменьніцкіх організацый ў справе разьвіцьця савецкае літаратуры. Яны імкнуцца гэты пункт высунуць і падкрэсьліць, стушаваць усе астатнія пункты ў пастанове.

Таксама памыляюцца і тыя, якія думаюць, што з пастановай ЦК паслабне клясавая барацьба ў літаратуры і ластаўка зможа ляцець куды яна захоча. Якраз наадварот, дзякуючы таму, што агонь будзе накіраваны супроць гуртковай політыкі розных груп пісьменьнікаў, яшчэ яскравей стануць прынцыповыя групт-лініі клясавай барацьбы ў мастацтве, яшчэ яскравей стане ідэолёгічны твар кожнага пісьменьніка і яскравей разам з гэтым боевыя позыцыі ў літаратуры.

...змагацца за бясклясавае грамадзтва

БелАПП за ўвесь час свайго існаваньня прайшоў вялікі пераможны шлях змаганьня за кадры пролетарскай літаратуры, за яе гегемонію. Гэта даведзена як вынікамі работы па выяўленьню пісьменьніцкіх адзінак з рабочага асяродзьдзя (заклік ударнікаў у літаратуру і інш.), гэтак і творчасьцю лепшых членаў Асоцыяцыі.

Аднак, у БелАПП'у, як організацыі авангарднай, былі і хібы. Аднэй з галоўных, я лічу—недастатковая ўвага да пісьменьнікаў-спадарожнікаў, асабліва да тых, якія знаходзіліся па-за сьцяной БелАПП'у. Аднабаковы падыход да адных і мінаньне другіх, стварала цяжкую атмосфэру, якая шкодзіла ідэёваму, а адсюль і творчаму росту данага пісьменьніка, абцяжарвала ўмовы ягонай перабудовы.

Лішнім будзе гаварыць, што рэорганізацыя нашага літаратурнага сягоньня вымагае больш пільнасьці ў вызначэньні напрамку таго ці іншага твору таго ці іншага пісьменьніка. Варожыя элемэнты яшчэ цалкам ня выжыты, кулацка-буржуазныя тэндэнцыі яшчэ маюць мейсца на фоне нашых дзён, і з гэтым усім патрэбна далейшае неслабнае і рашучае змаганьне. Але таксама ня менш патрэбны—глыбокае, таварыскае стаўленьне да кожнага пісьменьніка-спадарожніка, які шчыра імкнецца, альбо патрапляе ўжо ісьці з нашай савецкай рэчаіснасьцю, чулы падыход да ягоных індывідуальных асаблівасьцяй, стварэньне творчых умоў, пэўнае кіраўніцтва—для пасьпяховага перамаганьня гэтым спадарожнікам сваіх памылак, для пасьпяховай сапраўднай перабудовы на рэйкі соцыялістычнай будоўлі.

Пастанова ЦК УсеКП(б) на шмат падтрымлівае моральна, надае натхненьне на далейшую творчую работу шмат каму з спадарожнікаў, але яна і патрабуе ад іх проста і выразна трымаць свой твар у падзеях сёнешняга дню, сваёй творчасьцю дапамагаць соцыялістычнай практыцы, актыўна змагацца за бясклясавае грамадзтва.

Бясспрэчна, гэта запатрабаваньне спадарожніцкае кола павінна выканаць. У прыватнасьці—я сам.

Цішка Гартны

Пастанова ЦК дае ўпэўненасьць

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб перабудове літаратурна-мастацкіх організацый гаворыць коратка і ясна. Добра-б было, каб усе пісьменьнікі так ясна яе зразумелі, як ясна там гаворыцца. Такое маё пажаданьне, думаю ня будзе лішнім, бо калі асноўная маса савецкіх пісьменьнікаў зразумела пастанову правільна, то напэўна знойдзуцца адзінкі, што зразумелі яе па-свойму. У сувязі з гэтым трэба цьвёрда сказаць: пастанова ні ў якім разе не азначае таго, што пролетарская літаратура не апраўдала сябе і таму адбіраюцца ад яе нейкія прывілеі, а якраз наадварот: пролетарская літаратура так вырасла і ўмацавалася, што для яе ня страшны цяпер уплывы варожых элемэнтаў, што яна здолее пастаяць за сябе ў любы час. Зноў-жа пастанова не азначае, што пролетарская літаратура павінна здаць нейкія з заваяваных ёю позыцый, уступіць нешта з сваіх дасягненьняў; пастанова азначае, што пролетарская літаратура яшчэ шпарчэй пойдзе да новых дасягненьняў і павядзе за сабой усю савецкую літаратуру. Спадарожнікі і саюзьнікі, якія не ўваходзілі ў склад пролетарскіх пісьменьніцкіх організацый, з асаблівым задавальненьнем сустрэлі пастанову ЦК УсеКП(б), бо гэта пастанова дае ім вялізарнае моральнае падтрыманьне, дае большую ўпэўненасьць у працы і лепш забясьпечвае партыйнае кіраўніцтва ў асобе комуністычнай фракцыі адзінага саюзу савецкіх пісьменьнікаў.

Крапіва

Увядзем на ўзбраеньне нашай краіны магутную зброю бальшавіцкага мастацкага слова

Е. Гальперына

Заходня-эўропэйская літаратура рыхтуецца да вайны

(З дакладу на першай літаратурнай конфэрэнцыі пагранахраны і войск АДПУ БССР)

Цяпер, як вядома, узмоцнена ідзе падрыхтоўка вайны на Захадзе, вайсковыя заводы Эўропы працуюць поўным тэмпам з поўнай нагрузкай, але адначасова з гэтым ідзе падрыхтоўка і ідэолёгічная.

Буржуазія добра разумее, што ў выпадку вайны з СССР ёй давядзецца сустрэцца з цэлым шэрагам няпрыемнасьцяй для яе, з жаданьнем пролетарыяту Заходняй Эўропы павярнуць зброю ня супроць СССР, а супроць свае буржуазіі, і вось буржуазія ўсякімі сродкамі, усімі сіламі, ўсімі відамі пропаганды імкнецца адурманіць працоўныя масы Захаду.

Мастацкая літаратура адыгрывае тут не апошнюю ролю. Наша задача заключаецца ў тым, каб сыстэматычна разаблачаць падрыхтоўку да вайны, у час разаблачыць гэтую шкодную буржуазную літаратуру, якая інагды можа зрабіць уплыў нават на нашую савецкую літаратуру ў выглядзе рэмаркізму, пацыфізму і г. д.

Нашы заходнія таварышы, рэволюцыйныя пісьменьнікі Захаду, з свайго боку рыхтуюцца да магчымай сусьветнай вайны. Яны ў сваіх творах вядуць вялікую растлумачальную работу, популярызуюць ленінскае вучэньне пра вайну.

Мы маем адзіны вялікі вопыт, як буржуазія выкарыстоўвала мастацкую літаратуру ў сваіх мэтах, гэта вопыт вайны 1914 г. Ужо тады ў Заходняй Эўропе вызначылася вельмі выразная расстаноўка сіл у літаратуры, тады мы мелі вялікі росквіт буржуазнай нацыяналістычнай, патрыотычнай літаратуры, якая ўсякімі сродкамі імкнулася прышчапіць салдацкім масам жаданьне ісьці памерці за буржуазію, прычым часта рабілі гэта ў грубой цынічнай форме.

Мы ведаем, што цэлы шэраг буйных пісьменьнікаў Захаду, якія да 1914 г. спрабавалі крытыкаваць буржуазію, як напрыклад, Б. Шоў, А. Франс, у час вайны аказаліся захопленымі гэтым патрыотычным чадам, той шовіністычнай пропагандай, якую вяла буржуазія.

На VI конгрэсе Комінтэрну падкрэсьлівалася, што пасьля сусьветнай вайны, калі найшырокія масы працоўных на Захадзе ня хочуць вайны, баяцца яе, буржуазія прымушана прыбегнуць да розных маскіровак, пацыфізм становіцца офіцыйнай ідэолёгіяй буржуазных дзяржаў; па-другое, мы цяпер маем ужо не слабы атрад рэвалюцыйна літаратуры, надзвычайна моцны рух міжнароднай рэволюцыйнай і пролетарскай літаратуры, якая вядзе вялізарную работу, вялізарную антыімпэрыялістычную прапаганду, мы маем цэлы шэраг буйных твораў, якія вядуць барацьбу супроць сусьветнай вайны. Значыць, нашы сілы ў літаратуры непамерна вырасьлі.

Першым відам адчыненай падрыхтоўкі вайны займаецца фашыстоўская літаратура. Сам фашызм зьяўляецца адкрытым наступленьнем на рабочую клясу і фашыстоўская літаратура адлюстроўвае гэтае наступленьне.

Што робіць фашызм? На Захадзе ў апошні час зьяўляюцца такія рэчы як мэмуары розных генэралаў пра вайну 1914 г. і кнігі, якія выслаўляюць розных вайсковых правадыроў буржуазіі. Наогул, героізацыя 1914 г.—самы любімы прыём Заходняга шовінізму. Зьяўляецца цэлы шэраг кніг пра вайну 1914 г., у якіх ідэя бацькаўшчыны, ідэя гонару выступае на першы плян.

Гэтыя кнігі звычайна крывяжадныя: апісваюцца забойствы і сьмерці, смакуецца, як льецца кроў і ўсё гэта ў соусе патрыотычнага чаду з мэтай атуманіць салдацкія масы. Салдацкая маса апісваецца як стада, якое нічога не разумее, якое не павінна нічога разумець, гэта такі натаўп, які сьлепа павінуецца свайму правадыру, а з другога боку правадыры ўсякімі спосабамі ідэалізуюцца, падаюцца як надзвычайна моцныя, энэргічныя тыпы генэралаў ці фашыстоўскіх правадыроў, якія маюць надзвычайную моральную ўладу над натоўпам. Тут ускрываецца мэта гэтай літаратуры, яна дамагаецца таго, каб салдацкая маса ператварылася ў такое пакорнае стада.

Пісьменьнікі пачынаюць капацца ў новай тэхніцы, яны пачынаюць узьнята гаварыць пра ўдушлівыя газы, пра нябачаныя фантастычныя вынаходніцтвы, пра тыя «праменьні сьмерці», якія будуць зносіць ня толькі гарады, а і цэлыя краіны і г. д. Усё гэта ў рамантычнай форме.

Улюбёная ідэйка гэтых пісьменьнікаў тая, што фронт і тыл будуць зусім аднолькавымі ў будучай вайне, гэта значыць, што вайну па-сутнасьці будуць весьці не адны масы салдат, а будзе весьці выключна адзін невялікі атрад буржуазіі, тэхнічна вывучаны, а масы на вайне ня будзе.

Гэта праводзіцца для таго, каб упэўніць, што пролетарыят нічога ня зможа зрабіць, што ідэя павярнуць зброю супроць свае буржуазіі будзе немагчымай. Чаму? Таму, што ў пролетарыята ніякай зброі ня будзе. Гэтай фантастычнай ідэяй буржуазія хоча абяззброіць пролетарыят, унесьці пярэпалах у пролетарскія шэрагі.

Цяпер соцыял - фашысты Захаду звычайна выступаюць з пацыфісцкай маскіроўкай, але часамі і адкрыта. Францускі соцыял - фашыстоўскі пісьменьнік П'ер Амп, даволі вядомы ў нас, не пасароміўся напісаць п'есу «Гаспажа вайна», п'есу, якая адкрыта ідэалізуе будучую вайну, у якой ён ня толькі ідэалізуе новую тэхніку, але і займаецца вельмі цікавым прароцтвам пра новыя тэхнічныя вынаходзтвы. Там справа ідзе ня толькі пра ўдушлівыя газы новага тыпу, але і пра свайго роду моральныя ўдушлівыя газы. Амп лятуценіць мець такі тэхнічны апарат, каб, маючы супроць сябе масу салдат, прымусіць іх моральна абяззброіцца, зьнішчыць волю да барацьбы ў масах супрацоўніка.

Яшчэ адзін сродак выкарыстоўвае буржуазія, імкнучыся ўнесьці моральную дэзорганізацыю, — гэта рэлігія. У гэтай п'есе Ампа гаворыцца зусім выразна, што рэлігія гэта надзвычайны дысцыплінуючы сродак для таго, каб утрымаць салдацкую масу ў паслухмянасьці. Ды ўсе францускія фашысты ў сваёй літаратуры гавораць, што каталіцызм, рэлігія цікавіць іх галоўным чынам таму, што каталіцызм зьяўляецца моцным дысцыплінуючым сродкам.

У фашыстоўскай літаратуры ёсьць цэлы шэраг твораў, якія на першы погляд як быццам ня маюць дачыненьня да падрыхтоўкі вайны. Напрыклад, францускі пісьменьнік Монтэрлан піша цэлую сэрыю апавяданьняў пра спорт у якіх гаворыць што буржуазія павінна перамагчы сваю пасыўнасьць што ўсё гэта буржуазнае эстэтычнае перараджэньне непатрэбна, а тут патрэбна штосьці іншае. Ён гаворыць, што буржуазіі патрэбны цяпер моцныя людзі, фізычна моцныя, вынослівыя, людзі з моцнымі цяглiцамі. Вось гэта ідэя моцных цяглiць моцна засела ў галовах буржуазіі.

Ёсьць яшчэ адзін від падрыхтоўкі да вайны ў фашыстоўскай літаратуры — гэта распальваньне нацыянальнай і расавай нянавісьці. У гэты хор уплятаецца і шэраг буйных пісьменьнікаў буржуазнага Захаду. Прыкладам, вядомы францускі пісьменьнік Поль Моран, якога буржуазія называла каралём пісьменьнікаў, падкрэсьліваючы яго вялікае значэньне для яе, піша такую кнігу як «Чорная магія». Чорная магія» ставіць проблему каляровых і белых людзей. Для францускага імпэрыялізму мае значэньне дыскрэдытаваць СССР і рэвалюцыйны рух у колёніях. І вось гэтая проблема белых і ня белых людзей становіцца вельмі шырока ў заходняй буржуазнай літаратуры.

Я хочу спыніцца на цікавым романе Дынтэра — нямецкага нацыянал-соцыялісты, які ставіць проблему яўрэяў, проблему антысэмітызму. З гэтым таксама прыходзіцца мець справу на Захадзе. Антысэмітызм зараз асабліва ў германскай фашыстоўскай літаратуры мае шырокае распаўсюджаньне, як форма распальваньня нацыянальнай нянавісьці. Дынтэр піша, што яўрэям уласьцівы сьветапогляд матэрыялізму, сьветапогляд марксызму, сьветапогляд інтэрнацыяналізму, што, вядучы барацьбу з гэтым сьветапоглядам, патрэбна ў той-жа час весьці барацьбу супроць яўрэяў. Больш таго, ён разьвівае тэорыю чарапоў, па якой арыйцы, ідэалісты, маюць большы чэрап па фізыолёгічнаму тыпу, стаяць значна вышэй, чым яўрэі з матэрыялістычным сьветапоглядам, якія маюць такую форму чэрапа, што ясна гаворыць пра іх тупасьць і дурноты. Для нас такая «тэорыя» ўспрымаецца як анэкдот, але там пішацца пра гэта сур'ёзна з мэтаю адурачыць калі не пролетарыят, то ва ўсякім разе дробнабуржуазныя масы.

Ёсьць яшчэ цэлы шэраг твораў, накіраваных ужо непасрэдна супроць СССР, твораў антысавецкага характару. У гэтым ліку я хацела-б паказаць на роман Морана «Я палю Маскву». Вы ведаеце, што твор тав. Ясенскага «Я палю Парыж» зьяўляецца адказам на гэты антысавецкі роман.

Моран у свой час наведаў СССР і ён палічыў неабходным напісаць кніжку пра СССР, у якой ён дзеліцца сваімі ўражаньнямі. Што-ж гэты чалавек убачыў у нас? Ён убачыў тры факты: па-першае, абсолютны бруд, па-другое, ён упэўнівае, што ў нас усё насельніцтва знаходзіцца ў надзвычай падаўленым становішчы духа, аж да таго, што баіцца гаварыць, а па-трэцяе, што ў нас ніколі ніхто не сьмяецца. Цяжка гаварыць пра гэтае глупства сур'ёзна. Але што Моран хоча давесьці? Ён хоча давесьці, што тыя ўмовы, якія існуюць у Савецкім Саюзе накіраваны супроць шырокіх мас, што шырокія масы прыдушаны, баяцца сьмяяцца, што ўсюды пануе някультурнасьць, гразь. Гэта — адкрытая пропаганда таго, што СССР гэта барбарская дзяржава, і для таго, каб выратаваць заходнюю культуру, у першую чаргу трэба зьнесьці гэтую барбарскую дзяржаву.

Францускі крытык Гастон Рыў піша цэлы шэраг артыкулаў, у якіх падтрымлівае Брыана і ягоную ідэю стварыць пан-эўропэйскі антысавецкі фронт буржуазіі.. Рыу гаворыць, што мы пашыраем ранейшы лёзунг «Францыя — мая бацькаўшчына» і гаворыць «Эўропа — мая бацькаўшчына». Гэта робіць для таго, каб стварыць адзінны фронт супроць СССР. І Рыу сам ня ўтойвае гэтага крычучы пра чырвоны імпэрыялізм і небясьпеку.

Паўтары гады таму назад Міжнароднае аб'яднаньне рэволюцыйных пісьменьнікаў разаслала ўсім выдатным пісьменьнікам Захаду анкеты, у якіх пытала, «як вы будзеце весьці сябе ў выпадку новай імпэрыялістычнай вайны»? Атрыманыя адказы на гэту анкету вельмі цікавыя. Па-першае цэлы шэраг выдатных пісьменьнікаў наогул не палічылі патрэбным адказаць. Яны пабаяліся мець з намі якія там ня было размовы. Але шмат якія пісьменьнікі ня з колькасьці сапраўдных фашыстаў давалі такія адказы, якія нас ні ў якай меры задаволіць ня могуць. Адзін амэрыканскі пісьменьнік Шэрвуд — Андэрсон гаворыць: «Мая позыцыя тая-ж самая, што і ва ўсіх войнах: я ў вайну ня веру». Што гэта значыць, калі ён гаворыць, што ён у вайну ня верыць? Гэтым самым ён імкнецца давесьці, што ніякай падрыхтоўкі вайны не вядзецца. Гэта якраз тая ідэя, якую хоча давесьці Ліга нацый.

Другі амэрыканскі пісьменьнік піша: «Усёю сваёю слабою сілаю буду супраціўляцца гэтаму шаленству (вайне)», а далей ён гаворыць: «У кожнай краіне досыць слабых бакоў, каб можна было напасьці на яе знутры».

Аднаго ня было ў адказах гэтых буржуазных пісьменьнікаў гэта — выразнасьці. Адказы даваліся насумысьля нявыразнымі. Але калі цяпер іх позыцыя няясная, то калі пачнецца вайна яна будзе яснай. Калі цяпер яны не гавораць, што яны з намі, то з пачаткам вайны яны будуць супроць нас.

Вядомы амэрыканскі крытык Мэнкен гаворыць, што войны відаць бескарысныя, але ва ўсякім выпадку яны вельмі занімацельныя і што з гэтай прычыны ён ня супроць вайны. Такім чынам цэлы шэраг выдатных пісьменьнікаў надумысьля адказалі не акрэсьлена ці абмежаваліся жартам. Гэта значыць, што ўсе яны па сутнасьці падкрэсьліваюць офіцыйны пацыфізм, які пропагандуецца буржуазнымі дзяржавамі.

Але ёсьць яшчэ адзін від пацыфізму. Мы маем цэлы шэраг дробнабуржуазных пісьменьнікаў, якія думаюць, што яны выступаюць супроць капіталізму, але на самай справе падтрымліваюць капіталізм. У 1927-28 гг. на Захадзе пракацілася цэлая хваля пацыфісцкіх романаў, асабліва ў Германіі. Самым правым і найбольш рэакцыйным з іх зьяўляецца роман Рэмарка «На заходнім фронце бяз зьмен». Гэты буржуазны пісьменьнік думае, што ён выступае супроць вайны. Што ён дае ў сваім романе? Ён дае апісаньне жахлівасьці вайны, апісаньне мучэньняў у часе вайны, ня ўскрываючы ні ў якай меры ні імпэрыялістычнага яе характару, ні клясавых інтарэсаў, у імя якіх вядзецца імпэрыялістычная вайна, ня ўскрывае таго выхаду, які павінен быць з гэтай вайны. Што-ж застаецца тут? Застаецца об'ектывісцкая падача чалавечых мучэньняў.

Якую-ж політычную ролю адыграе гэты твор? Трэба сказаць, што многія нашы крытыкі ня здолелі адразу разабрацца ў яго функцыі. Пару гадоў таму назад яны пісалі, што роман Рэмарка ня ўскрывае прычын вайны і ў гэтым яго дробнабуржуазная абмежаванасьць, але ва ўсякім выпадку ён дае надзвычайна добрае адлюстраваньне вайны, яе жахлівасьцяй ды інш.

На беларускай мове роман Рэмарка вышаў з прадмовай К. Радэка, дзе Радэк піша, што роман Рэмарка гэта лепшы твор пра сусьветную вайну.

Я хочу тут спыніцца яшчэ на другім романе Рэмарка «Зварот». Гэты роман зьяўляецца працягам «На заходнім фронце бяз зьмен». Гэты роман цікавы тым, што тут у вельмі разумнай і тонкай форме пропагандуецца ідэолёгічная падрыхтоўка вайны.

У Рэмарка ўжо ў першай кнізе ёсьць моманты ідэалізацыі вайны, акрэсьлена ідэя пра тое, што на фронце мы маем клясавы мір, што на фронце ёсьць пазаклясавае таварыства ўсіх, якія вядуць вайну, пачынаючы з радавога салдата і канчаючы афіцэрамі і генэраламі Рэмарк супроцьстаўляе з аднаго боку тых, хто ў даную хвіліну знаходзіцца на фронце, і тых, якія ў даную хвіліну знаходзяцца ў тылу. Такім чынам, атрымліваецца і тыл і фронт паза клясавым.

Рэмарк ужо ў першай кнізе паказвае, што вайна мае адну вялікую перавагу, што на фронце людзі ў хвіліну небясьпекі прыходзяць да брацтва, таварыскасьці, людзі пачынаюць адзін да аднаго ставіцца па-брацку. Гэтая шкодная ідэйка праводзіцца ў другой кніжцы больш ярка. Там проста гаворыцца, што калі наступае першы дзень перамір'я, салдатам проста цяжка ісьці з вайны, таму што яны звыкліся з гэтай абстаноўкай, таму, што там склалася дружная салдацкая сям'я і шкода разрываць яе.

Далей ідзе наступнае: гэтая групка салдатаў зьвяртаецца да хаты і Рэмарк паказвае, як гэтыя салдаты ў тылу адчуваюць сябе чужымі. Яны прыходзяць у сваю сям'ю і не знаходзяць агульнай мовы з блізкімі.

Рэмарк выкарыстоўвае вельмі тонкую дэмагогію. Ён гаворыць, што ў буржуазнай Германіі, у гэтай буржуазнай рэспубліцы, абвострана клясавая розьніца, профэсыянальныя супярэчнасьці, супярэчнасьці людзей, якія знаходзяцца на вяршыні грамадзкай лесьвіцы і ўнізу яе, а на фронце гэтага няма. Што ён хоча давесьці? Што салдат, зьвярнуўшыся назад у тыл, стыкаецца з усімі гэтымі няпрыемнасьцямі, з тым, што адны стаяць наверсе, другія ўнізу, адны другіх прыгнятаюць, і салдаты адчуваюць сябе чужымі, адчуваюць сябе выкінутымі з буржуазнай Германіі. Рэмарк хоча сказаць, што людзі, якія ненавідзяць буржуазную нямецкую рэспубліку, павінны імкнуцца да вайны таму, што там няма гэтых клясавых супярэчнасьцяй, клясавай розьніцы. Ён паказвае, як усе гэтыя людзі, што вярнуліся з фронту, ці канчаюць самагубствам ці турмой таму, што яны ня ведаюць, што рабіць, і яны нарэшце лятуценяць пра новую вайну, якая-б дала выхад з тупіка, у які зайшла буржуазная Германія.

Больш таго, Рэмарк дае тонкую форму патрыотычнай пропаганды. Ён разьвенчвае грубыя формы патрыотызму, яго знадворны бок, барабанны бой. Ідэю бацькаўшчыны Рэмарк абараняе іншым спосабам. У разуменьні бацькаўшчыны ён укладвае германскія палі, германскія лясы, прыроду і выходзіць, што іх вось і патрэбна абараняць.

Дробнабуржуазныя пацыфісцкія пісьменьнікі разышліся за апошнія гады ў розныя бакі. Ужо тая хваля пацыфісцкіх твораў, якая пракацілася пару гадоў назад, ня была аднароднаю. З тых часоў гэтыя пісьменьнікі разышліся ў розныя бакі. Рэмарк пашоў направа па лініі фашызацыі, і многія пісьменьнікі пашлі налева, наближаючыся да нас (напрыклад, Э. Глезэр).

Асабліва паказальны шлях Ромэн Роляна, які паўгода таму назад у анкеце, пра якую я гаварыла пісаў так: «Многія з нас ніколі ня былі і ня будуць комуністамі. Я памру, як і жыву, свабодным індывідуалістам. Але сягоньня прэч разнагалосьсі: мы яднаемся перад тварам агульнага ворага».

Вы бачыце, якая ў яго яшчэ тут хісткая пазыцыя. Ён прынцыпова гаворыць, што ён не комуніст і комуністычных ідэй не падзяляе, але ў імпэрыялістычнай вайне будзе абараняць СССР, таму што ён верыць у тое, што СССР паказвае шлях у будучыню. З тых часоў Ромэн Ролян прайшоў вялікі шлях улева, адмаўляючыся ад свайго мінулага пацыфізму і пераходзячы на позыцыю рэволюцыйнага спадарожніцтва.

Лепшыя пісьменьнікі Захаду за апошнія гады прыходзяць да таго, што пачынаюць нас сьвядома абараняць бяз усякіх агаворак.

Да нашых пісьменьнікаў мы падыходзім з аднэю меркай — з пункту погляду таго, наколькі яны праводзяць у мастацкай літаратуры ленінскае вучэньне пра вайну, наколькі яны ў сваёй рабоце выконваюць задачы, якія даюцца Комінтэрнам. Якія асноўныя гэтыя задачы? Па-першае, гэта выразнае і яснае раскрыцьцё прычын вайны і яе імпэрыялістычнага характару, гэта ўпартая барацьба супроць пацыфізму, супроць той пацыфісцкай лініі, калі ўсе віды войн, пачынаючы з грамадзянскай і канчаючы імпэрыялістычнай, падводзяцца пад рубрыку «вайны наогул». Гэта лінія нашымі пісьменьнікамі павінна быць разьбіта канчаткова.

Нашы пісьменьнікі ня могуць падыходзіць да гэтае тэмы як Рэмарк.

Рэвалюцыйныя пісьменьнікі Захаду пішуць і пра мінулую вайну і пра вайну будучую. Ёсьць ужо цэлы шэраг рэволюцыйных твораў пра вайну 1914 г., у якіх ускрываецца яе імпэрыялістычны характар і даецца разьвіцьцё клясавай самасьвядомасьці ўдзельнікаў яе. Адной з лепшых кніг зьяўляецца роман Шарэра «Без бацькаўшчыны», які вывучае вопыт 1914—1918 гг. з пункту погляду барацьбы супроць будучай вайны. Буйны твор Бэхэра «Люізіт» адлюстроўвае будучую вайну, выкрываючы яе падрыхтоўку. Можна апісваць мінулую вайну, будучую вайну, важна толькі, каб ленінская ўстаноўка ў пытаньнях вайны была даведзена да канца.

Ёсьць яшчэ адзін надзвычайна моцны сродак, гэта пропаганда пяцігодкі, пропаганда СССР. З гэтага пункту погляду гэткія творы як «Вялікі плян» Бэхэра — таксама ёсьць від барацьбы супроць інтэрвэнцыі, за абарону СССР. Калі буржуазныя пісьменьнікі даюць антысавецкія творы, дык нашы пісьменьнікі павінны пісаць творы, якія популярызуюць СССР, калі там замаскоўваюць прычыны вайны, дык нашы пісьменьнікі павінны ўскрываць гэтыя прычыны, калі там затушоўваюць выйсьце з вайны, дык нашы пісьменьнікі павінны паказваць рэволюцыйны выхад з гэтай вайны. Гэтыя задачы шчыльна зьвязаны з задачамі нашых савецкіх пісьменьнікаў.

Зяма Півавараў

З гістарычных дат

Калі вецер
у шкло
тройчы ўдарыў
крылом,
гэта значыць,
будзе
навала—
гэта заляскатаў
над сялом
бізун
урадніка
Канавалава.
Жабрачаму народу
даюць гора-атруту.
Вып'і на!
Жабрачы народ
пад імпэратарскім
ботам
і цяжкай
рэформай
Сталыпіна.
А потым:
ноч крывавая
выпінаецца,
нібыта воспа,
з вогненай
ішмы,
А потым:
дзікая
людзкая роспач
на зямлі.
Ад варштатаў
ад крывулек—сох
людзі дужыя забраны,
галовы класьці
на сыры
пясок—
Рабіць
шкілетныя
курганы.
О! «шкода людзей»
пацыфістым,
цяжка бачыць ім
адсечаныя ногі-рукі,
або галаву,
што вандруе
па бруку,
зьнятую
варожым
кавалерыстам.
Нас ня вучыць!
ведаем
навошта выстаўляліся
ненасытныя
гарматныя
жэрлы,
Завошта змагацца?
Каго біць?
У гэтым
ляжыць адно:
Роскаш,
шампанскае віно.
Франты
да чортавай
матары кінь!
У гэтым
ляжыць адно:
Рынкі,
матэрыкі.
Ды яшчэ зараз яны
пад валаспады
гарачых Verdo
аб разбраеньні...
высокія фразы,
а ілжывае вока,
падміргваючы
пад лёрнэтам,
рыхтуе
новые газы.
Шукаючы сабе
пляцдармы,
Старты шукаючы,
адкуль першыя эскадрыльлі
маглі-б
лётаць,
яны ціхі акіян
расчапілі-б на шматкі
у часе навальніц і бур.
Хочацца Амэрыцы,
Каб уздапаможнай базай
яе морскага флёту
была-б Сітка
і Дэч-Харбур.
Ім хочацца
закрэсьліць нас
на эўропейскай
карце,
А мы
ў сталёвым гарцы
Будзем
на варце!
Менск Сьнежань 1931 г.

Цішка Гартны

Перадрэволюцыйная „Правда“

(Да 20-годзьдзя газэты)

Вясною 1912 г. я працаваў гарбаром у павятовым горадзе Ковеншчыны—Вількаміры. Глухі і захалусны горадок налічываў чатыры гарбарні з 20-ю ці каля гэтага рабочымі. Вількамірскія гарбары, як і наогул гарбары ў Беларусі таго часу, складалі з сябе больш перадавы атрад мясцовага рамесьніцка-завадзкага пролетарыяту. Даволі паказаць на шэраг бурных выступленьняў ў 1905 і 1906 г. г. смаргонскіх, віленскіх, крынскіх, ашмянскіх гарбароў, на іх буйныя стачкі і дэмонстрацыі гэтага пэрыоду і пазьней, каб пераканацца ў гэтым. І да рэволюцыі 1905 г. і пасьля рэволюцыі сярод гарбароў Беларусі ваадзілася за прасіла дапамагаць сваім таварышом, якія з прычыны звальненьня з працы ці беспрацоўя, вандравалі ў пошуках работы з гораду ў горад. Вандроўніку рабочыя падшуквалі працу, кармілі, і калі працы ў даным горадзе не знаходзілася, давалі ліст (ці з партыйнай ці з профэсыйнай пячаткаю) у бліжэйшы горад. Гэта добрая традыцыя сьведчыла за высокую ступню пралетарскай клясавай солідарнасьці. Яна існавала ,пачынаючы ад Вільні і канчаючы Капылем ці Клецкам.

Ведалі і пільнаваліся яе і вількамірскія таварышы-гарбары, якія, у сваю чаргу, прайшлі ў павятовым маштабе рэволюцыйную школу 1905 г. Каля трох гадоў яны ўтрымоўвалі сваю заваёву васьмігадзіннага працоўнага дню і расталіся з ім не без бою. Расталіся ды не забывалі таго, што трэба як найхутчэй варочаць яго назад. 1912 г. даваў надзеі на гэта. У Расіі пачалося ўжо ажыўленьне рабочага руху. Адно за другім ішлі выступленьні рабочых у прамысловых цэнтрах. Гучэла рэха ленскага расстрэлу. Бальшавіцкая газэта «Зьвязда» прыносіла весткі аб стачках і забастоўках, аб адчыненьні рабочых дамоў і культурна-асьветных дамоў і культурна-асьветных таварыстваў, аб аднаўленьні старых і організацыі новых профсаюзаў, аб пашырэньні работы страхкас. «Зьвязда» атрымоўвалася, хоць і рэдка, у Вількамірскай грамадзкай бібліотэцы і прачытвалася ад дошкі да дошкі. Тыднёвы тэрмін яе выхаду не перашкодзіў вычытваць у друкаваных радкох «рабочае хронікі» і аддзелу «па фабрыках і заводах» нарастаючы ўздым рэволюцыйнага руху. Ён упарта. «Праўду» вількамірскія гарбары праз усякія заметкі і перашкоды.

Выхад штодзённае бальшавіцкае рабочае газэты, якою зьявілася «Праўда», асабліва выразна падкрэсьліла гэта. «Праўду» вількамірскія гарбары сустрэлі з распасьцёртымі рукамі як вялікае сьвята, як вялічэзнае здарэньне. Яе выхаду чакалі з напружанаю ўвагаю, чытаючы і перачытваючы анонсы.

Вельмі ўжо абрыдлі буржуазныя шалапутлівыя, хлусьлівыя лісткі, як бульварная «Биржевка» II выд. «Современка» («Современное слово»), чым карміла провінцыю буржуазія. «Зьвязда» пасьпела ўнесьці прасьвятленьне ў суцэльную пляму провінцыянальнае шэрані, але гэта рабочая газэта, паперш, ня была штодыднёвікам, па-другое, яна даходзіла да Вількаміра праз два-тры, а то і больш, нумары. Поліцыя старалася як магла і ўмела (а гэта яна ўмела!) не дапусьціць «Зьвязду», калі яна ня была сканфіскавана ў друкарні, далей пецярбурскага паштамту. І часта было тры-чатыры тыдні прамежку паміж атрыманьнем двух яе нумароў. Зразумела, што царскі ўрад ня думаў зьмяняць сваіх адносін і да «Праўды». Больш таго, рабочая штодзёнка магла чакаць належнага шчырэйшага дбаньня аб сабе з боку патайнае і наяўнае паліцыі. Так яно і было: цэнзура не драмала, каб перасьціць кожны нумар белымі плямамі, праз адзін, праз другі ўчыняць конфіскацыі, арыштоўваць рэдактароў і накладаць штрафы, а пошта—губіць у дарозе сотнямі выпісаную «Праўду» ў провінцыю. У Вількаміры назбіраліся да дзіву частыя перабоі ў атрыманьні газэты, кожнага нумару якое чакалі. За тое прыходзіўшыя нумары зачытваліся, конвэйерам пераходзячы з рук у рукі. Выпісаных 2-х ці 3-х экзэмпляраў грамадзкую чытальню не хапала. Тады некалькі чалавек з гарбароў выпісалі «Праўду» на свой адрас. Але, рэдка пападаючы ў чытальню, «Праўда» яшчэ радзей прыходзіцца індывідуальным падпісчыкам. Гэта ня служыла перашкодаю да выпіскі. Кожная выпіска ня толькі служыць пашырэньню газэты, а і пад могай для яе існаваньня. Улічваючы аднэдласьць сродкаў у выдаўца, царскі ўрад дзень у дзень мерыўся прыдушыць «Праўду» шляхам эконамічнага націску—штрафамі. І для самаабароны з гэтага боку рэдакцыя заснавала «жалезны фонд» «Праўды», у які з усіх куткоў вялікае краіны пасыпаліся рабочыя адлічэньні. Не асталіся ў баку і вількамірскія гарбары. Ініцыятыву ўзяў я і перш пазнаёміў Абраму Слуцкаму, а далей правёў збор.

Была сабрана невялікая сума, нешта, каля дзесяці рублёў, але гэта сума яскрава паказала, як вількамірскія гарбары адносіліся да «Праўды» і як яе берагалі ды шанавалі.

Пад восень 1912 г. я пакінуў Вількамір і вярнуўся ў Капыль.

Я прывёз таварышам многа нячутых імі вестак і падбіў іх на зацікаўленьне новым уздымам, які ахапляў рабочыя масы. Разам з гэтым я расказаў аб пачатай вясною выдаваньня газэце «Праўде». Хлопцы сустрэлі мае паведамленьні з вострай цікавасьцю. Неадкладна мною і яшчэ двума другімі гарбарамі былі выпісаны тры экзэмпляры «Праўды».

Газэта «Праўда», апынуўшыся ў мястэчку, бойка пашла па руках. Весткі з жыцьця рабочых, з іх політычнага і эконамічнага змаганьня, бадзёрылі і рэволюцыянізавалі Капыльскую моладзь. «Праўду» чыталі ў майстэрнях у абедзены перапынак, чыталі на зборнях, па хатах. Перабойны прыход яе ў Капыль сустракаўся, як дарагі гасьцёнец. Да мяне ў хату прыходзілі слухаць «Праўду» старыя капыляне, якім я часта чытаў яе нядзелямі і сьвятамі на зборах каля тае ці іншае хаты, на прызьбе. Чытаньне адганяла ўбок усе іншыя гутаркі і клапоты і прыцягвала пільную ўвагу жанок і мужчын. Яшчэ і дагэтуль стаіць у маім вачу старанны і цікавы мой слухач з капылян, Радзён Рубіс, які кожны вечар наведваў да мяне і прасіў або чытаць «Праўду» або расказваць з яе навіны. Пры кожнай сустрэчы са мною Радзён яшчэ здалёк гукаў: «Зьміцер! А што «Праўда» паведамляе?» Я на хаду перадаваў стараму важнейшыя весткі і ён у захапленьні радаваўся: «Так, так! Хутка ўсе яны, і губарнатары і міністры, пакруцяць галовы. Няхай толькі рабочыя як сьлед прымуцца». Перачытаныя нумары «Праўды» ў Капылі ішлі на вёску. Кожную нядзелю прыязджалі па яе таварышы з сёл (Мікалай Лазаўскі, Сьцяпан Цьвірка-Годыцкі, Павал Курловіч і інш.) і бралі ад мяне некалькі нумароў газэты. Я кажу некалькі, бо «Праўда» вельмі часта не дайходзіла да нашае глушы.

Але выпіскаю трох экзэмпляраў «Праўды» і яе заўзятым чытаньнем Капыльская перадавая рамесьніцкая і земляробская моладзь не магла поўнасьцю перадаць сваёй газэце клясавага пачуцьця солідарнасьці. Дзеля гэтага патрабаваўся яшчэ які-колечы факт. Гэтым фактам зьявіўся збор у «Жалезны фонд» «Праўды». На гэты раз і зноў я падаў ініцыятыву, адаля з таварышом Рыгорам Шкурынскім узімку 1913 г. абышоў майстэрні і зборні, а таксама паасобных таварышоў і сабраў па 10 ды 20 кап. ажно на 27 руб. У справаздачы газэт аб паступленьнях хутка была адзначана прысланая сума, «групаю Капыльскіх рабочых». Гэта надзвычай узрадавала капылян, якія з гордасьцю і задаваленьнем перачытвалі справаздачу рэдакцыі.

Увесну 1913 г. я паехаў у Пецярбург. Як асяродак рабочага і рэволюцыйнага руху, аслаўлены гэроічнымі ўчынкамі і выступленьнямі мільённых мас пролетарыяту і паасобных энтузіастаў з шэрагаў нерадавольцаў, багатага вялікімі здарэньнямі ў справе змаганьня за вызваленьне рабочае клясы, Пецярбург непераможнаю сілаю прыцягваў мяне да сябе. Доўгі час я вагаўся пакінуць знаёмыя мне невялічкія гарады Беларусі з малалікім рамесьніцка-фабрычным пролетарыятам, ужо вывучанымі мною ўмовамі працы. Нарэшце вырашыў і паехаў. Некалькі маіх капыльскіх таварышоў ужо па два гады і больш знаходзіліся ў Пецярбурзе і няспынна запрашалі мяне.

Перад ад'ездам з Капыля я злажыў пэтыцыю на імя бальшавіцкае фракцыі Дзяржаўнае думы, сабраў да 30 подпісаў сялян і парёз яе па назначэньні. Го, як мне рупела праз усю дарогу хутчэй зьявіцца ў памяшканьне фракцыі, пагутарыць з членамі думы, Бадаевым ці Пятроўскім, Шагавым ці Самойлавым і з рук у рукі перадаць ім дамаганьні капылян зямлі і волі! Ня меней прагло мяне пабываць і ў рэдакцыі «Праўды», куды я вёз некалькі нарысаў і вершаў на расійскай мове. Мне так хацелася стаць супрацоўнікам рабочае газэты, дзе ўжо прымігнула шмат рабочых поэтаў і прозаікаў, прысьвечаўшых свае баявыя вершы і апавяданьні рабочаму жыцьцю і іх змаганьню. Аб рабоце мне чамусьці мала думалася, хоць я ехаў з 15 руб. у кішэні ў горад, які ня вельмі гасьцінна зьбіраўся мяне спаткаць.

Па прыезьдзе ў Пецярбург першым чынам я аднёс пэтыцыю ў сакратарыят бальшавіцкай фракцыі Дзяржаўнай думы, памяшканьне якога знаходзілася на рагу Сямёнаўскай вуліцы і Ліцейнага праспэкту. На маё няшчасьце, я там не застаў ніводнага дэпутата і перадаў пэтыцыю сакратару. У рэдакцыю «Праўды» я не сумеў першымі днямі аднесьці свае творы—адразу-ж апанавалі мяне клопаты аб кватэры. Мой таварыш Тодар Станілевіч, да якога я заехаў, жыў у гэткай маленькай каморцы ў Лясным, што літаральна ў ёй нельга была павярнуцца. Пры гэтым ён ужо знаходзіўся на падазрэньні ў паліцыі і быў на чарзе да арышту, які неўзабаве даў яму крыху большую адзіночку ў «Доме предварительного заключения», ён засьцярагаў ад сваё долі маю асобу, даўшы мне сяк-так ночаў тры пераначаваць, пасьля пераправіўшы мяне на Пецярбурскую старану.

Астаўшыся працаваць на заводзе «Вулкан» і запісаўшыся ў рабочае культурна-асьветнае таварыства «Знание», я пачуў пад нагамі грунт і скора стаў пісаць адну за другой карэспондэнцыі ў «Праўду». У карэспондэнцыях я асьвятляў становішча рабочых на заводзе, культурны ўзровень, абыходжаньне з імі майстраў, агітаваў за выпіску рабочых газэт і за ўступленьне ў культурна-асьветныя таварыствы. Але пасылаць карэспондэнцыі праз пошту было больш як рызыкоўна. Па-першае, гэта станавіла ў небясьпеку іх аўтара, па-другое, яны напэўна не маглі дайсьці па адрасату. І ніхто з карэспондэнтаў у Ленінградзе гэтага не рабіў: допісы насілі ў рэдакцыю «Праўда». Панёс і я. Друкарня «Праўды» знаходзілася на былой Іванаўскай вуліцы д. 14, у якой друкавалася і газэта «Дзень». Уласьнікам друкарні быў нехта Бярэзін, выдавец «Дню». Рэдакцыя-ж вельмі часта мяняла свой адрас. Тады яна зьмяшчалася на вуліцы Дастаеўскага. Пашоў я ў рэдакцыю «Праўды» адвячоркам, пасьля работы, з некалькімі вершамі, нарысамі і першай карэспондэнцыяй. Па дарозе, на Сьвечным завулку ўжо можна была бачыць дзесяткі рабочых, якія сьпяшылі ў рэдакцыю па розных справах. Але вопытнаму воку можна было пазнаць і тых соглядатаяў у выглядзе юркіх, клапатліва тупаўшых, асоб, якія надыходзілі на сочку з Мытнінскай набярэжнай, дзе мясьцілася ахраннае аддзяленьне. Я досыць нядбала аднёсься да гэтых гарохавых польтаў і з заміраньнем сэрца ўвайшоў у памяшканьне рэдакцыі. Дзьверы былі не запертымі і, як на вакзале, няспынна адчыняліся і зачыняліся. Бо так сама, як на вакзале, дэфілiравала публіка—выключна рабочая, проста з-заводу, закапцелая, у засмальцаванай вопратцы.

У памяшканьне нельга была праціснуцца па калідоры: і пачакальня і прыёмная былі бітком напіханы рабочымі. За голым сталом у правым ад выходу пакоі сядзеў сярэдніх гадоў таварыш, у рабочым гарнітуры і па чарзе вёў гутарку з наведвальнікамі. А чарга была не малая, гэтак чалавек у сорак, а то і больш. Я стаў за апошнім і праз пяць хвілін меў за сабою чалавек з дзесяць. Пакуль дайшоў да сакратара (то быў ён прастаяў добрых дзьве гадзіны, а гутаркі было зусім мала, я перадаў яму згорнуты шматок сьпісаных лісткоў і скромна папрасіў: «Калі падыйдзе—надрукуйце ў «Правде». Сакратар мне падзякаваў і падаў руку на разьвітаньне. Я адразу не пакінуў рэдакцыі, а прыслухаўся да гутарак і спрэчак, якія ў голас, як у клубе, вяліся на політычныя тэмы прысутнымі тут рабочымі. І сапраўды гэта быў рабочы клюб, месца, дзе перадаваліся навіны з заводу на завод, ішлі лятучыя абгаворы з куткоў змаганьня на тым ці іншым заводзе, рабілася праверка чутак аб забастоўках і выступленьнях. Характар рэдакцыі «Праўды», як політычнага рабочага клюбу, зрабіў на мяне моцнае ўражаньне. Да гэтага часу я меў выпадкі наведваць шэраг провінцыяльных рэдакцый ў Вільні і ў Кіеве, нават мой зямляк, той-жа Тодар Станілевіч, завёў аднойчы мяне у рэдакцыю меньшавіцкага «Луча». І ўсюды была іншая карціна. Вельмі яскрава кідалася ў вочы розьніца, якая была паміж рэдакцыяй «Праўды» і нават рэдакцыяй «Луча». У рэдакцыі «Луча» была ціха і сумна, маўклівымі ценямі тупалі адзінокія інтэлігенты, з якіх некаторыя наведвалі «Луч», пабыўшы да гэтага ў «Дню».

Праз некалькі дзён пасьля майго першага наведваньня рэдакцыі «Праўды» на яе старонках зьявіўся нарыс з жыцьця гарбароў, загалоўкам «В мастерской». Сьледам была надрукавана карэспондэнцыя з заводу «Вулкан», яшчэ праз некалькі дзён зьявіўся верш «Говорголы». Я быў па-за сабою ад задавальненьня і гордасьці, угледзеўшы свае творы на старонках «Праўды». Гэта ня ўпяршыню ўжо маё прозьвішча трапляла ў друк, але яшчэ ні разу я не адчуваў сябе ў гэткім бадзёрым і ваяўнічым настроі, як трапіўшы на старонкі рабочае газэты, якую ўжо болей году не выпускаў з рук!

Пасьля першых наведаў рэдакцыі пашлі наступныя: мяне цягнула на вул. Дастаеўскага, а матэрыялу для карэспондэнцый хапала. Як і першы раз, я гадзінамі праседжваў у гутарцы з рабочымі з розных заводаў, варочаючыся на кватэру даволі позна.

Апрача гэткага віду сувязі з «Праўдой» я яшчэ ўзмацняў яе шляхам непасрэднага распаўсюджваньня газэты. Працуючы ў начную зьмену на заводзе, я вяртаўся на кватэру раніцою. У гэты час газэтчыкі-хлапчукі, звычайна, накіроўваліся да выхаду з сьвежым нумарам «Праўды». І калі гэта быў нумар сконфіскаваны яны цілкам перадавалі нам для распрадажы ў майстэрнях. У майстэрні вырабу вагонных прыцэлаў і хамуткоў, дзе я працаваў на мэханічным фрэзэрным станку, распаўсюджаньне «Праўды» і збор падпіскі ляжалі на мне. Старшы па цэху, таварыш Мухін, пазьней дазнаўся, што я зьяўляюся і аўтарам карэспондэнцый з «Вулкана» ў «Праўду», пахваліў мяне, але пра гэта нікому не сказаў, каб не дазналася адміністрацыя, якую я жорстка прабіраў у сваіх допісах.

У 1914 годзе пасьля 5 месяцаў беспрацоўя я застаўся на службу ў выдавецтве «Новый человек». Абставіны, якія склаліся тут, сталі зусім іншымі ад вулканаўскіх. Служачых разам са мною налічвалася ўсяго трое чалавек: загадчык выдавецтва, экспэдытар і разам карэктар (я) і пасыльны. Работы было настолькі многа, што яна працягвалася для мяне ад 9 раніцы да 11 ночы. Я амаль нічога ня мог пісаць, томячыся да ашаламленьня. Ледзьве-ледзьве хапала часу прачытаць «Праўду», пісаць допісаў ня было калі. Але я ня кідаў надзеі крыху зволіцца ад перагрузкі і працягваць пісаць нарысы.

Між тым падзеі ішлі да іншага. Напаленая атмосфэра ў міжнародных адносінах набліжала конфлікт, які зыбухнуў 28 чэрвеня ў стрэле сэрбскага гімназыста ў Сараеве. Памятаю, што хутка пасьля гэтага здарэньня ў пачатку ліпеня, чуць што не ў самы той дзень, калі вышаў апошні нумар перадрэволюцыйнае «Праўды», у таварыстве «Знание» мелася адбыцца мая лекцыя на тэму аб нацыянальным пытаньні ў асьвятленьні соцыял-дэмократыі. Калі я прышоў на Грабецкую да памяшканьня таварыства, у дзьверы перад запёртымі дзьвярмі, на якіх вісела распараджэньне паліцыі аб забароне лекцыі, стаяла да дзесяці чалавек членаў таварыства і абгаворвала падзеі дню. Я прайшоў ў памяшканьне таварыства чорным ходам і застаў там некалькі членаў праўленьня разам з прыставам: рэч ішла аб становішчы таварыства, якое праз некалькі дзён было закрыта.

Самадзяржаўе, рыхтуючыся да вайны, надзявала на краіну жалезны панцыр перадсьмертнага праяўленьня сваіх нячуваных рэакцый і рэпрэсій.

Яны цягнуліся цэлых тры гады, каб зьмяніцца перамогаю рабочае клясы. «Праўда» аднавілася ў сакавіку 1917 г. як орган партыі бальшавікоў—организатара і кіраўніка пролетарскае рэволюцыі.

V год работы Яўрэйскага Дзяржаўнага Тэатру БССР

פינף יאר ארבעט פון יידישן מעלוכע-טעאטער אין ווייסרוסלאנד

Пэрыяд дыктатуры пролетарыяту і соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР ёсьць пэрыяд росквіту нацыянальных культур, соцыялістычных зьместам і нацыянальных формаю (Сталін)

Мастацкі кіраўнік ЯДТ заслужаны артыст М Рафальскі

Наперад да далейшых перамог!

«Літаратура і мастацтва» шле гарачае прывітаньне Яўрэйскаму Дзяржаўнаму Тэатру БССР у сувязі з яго пяцігадовым юбілеем.

Яўрэйскі Дзяржаўны Тэатр БССР, перамагаючы нацыяналістычныя і буржуазна-формалістычныя ўплывы, разьвіваўся і вырас у магутную зброю выхаваньня шырокіх рабочых і працоўных мас у духе ленінізму і барацьбы за генэральную лінію партыі. Шэраг пастановак тэатру за апошні пэрыяд выразна паказвае, як тэатр атрымлівае перамогу за перамогай у сваім імкненьні служыць соцыялістычнаму будаўніцтву краіны і ўмацаваньню абароназдольнасьці нашых меж.

Наперад, да далейшых перамог! За бальшавіцкае мастацтва, за высокую якасьць тэатральнай продукцыі, за творчы рост колектыву і кожнага актора ўпаасобку, за органічную і непарыўную сувязь усёй работы з рэволюцыйнай практыкай партыі і рабочае клясы, за ажыцьцяўленьне задач другой пяцігодкі, за рэалізацыю паказаньняў т. Сталіна, за ленінскую нацыянальную політыку!

ГАЗЭТА «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА».

„Авечая крыніца", паст. Літвінава

Л. Душман

Нацыянальны тэатр пры царызьме

Цяпер, калі мы сьвяткуем 5-ці-гадовы юбілей існаваньня яўрэйскага дзяржаўнага тэатру Беларусі, які адыгрывае вялізарную ролю ў разьвіцьці соцыялістычнай культуры, пролетарскай па зьмесьцу і нацыянальнай па форме, дык надта цікава зьвярнуцца да таго цяжкага часу становішча тэатру ў той час, калі Беларусь стагнала пад ботам царызму.

Заява настаўніка Амбразевіча і адказ губарнатара яскрава ілюструюць тое прыгнечаньне, пад якім знаходзілася да Кастрычнікавай рэволюцыі кожная спроба на шляху культуры на роднай мове, на мове, блізкай рабочай клясе.

Нехай гавораць дакуманты Беларускага дзяржаўнага гісторычнага архіву.

Настаўнік Ігуменскай школы Сільвестр Грыгоравіч Амбразевіч зварачваецца да Менскага губарнатара з наступнай заявай:

ПРОШЕНИЕ

Имею честь покорнейше просить Ваше превосходительство разрешить пастановку спектакля на белорусском языке 21-го сего июня в помещении общего собрания в пользу недостаточных учеников Игуменского высшего начального училища. Программа спектакля: 1) «У зімовы вечар» сочин. Э. Оржешко, 2) Концертное отделение 3) Сватанье, соч. А. Чехова.

Июнь, 14-го дня, 1914 г.

г. Игумен Минской губ.

Губарнатар запрашае думку кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі і атрымоўвае наступны адказ:

Министр. Нар. Прос.
Попеч. Вилен. Учеб.
Окр. Канцеляр. стол 4
Июня 24-го дня
1914 г.
№ 15688

Г-ну Минскому губернатору.

Вследствие отношения от 20-го сего июня за № 2814, имею честь уведомить Ваше превосходительство, что управление учебного округа не находит возможным разрешить пастановку в. г. Игумене спектакля на белорусском наречии в пользу недостаточных учеников Игуменского высшего наачльного училища, так как общегосударственным языком в учебных заведениях является язык русский.

Управляющий округом.

Окружной инспектор АЛ. ПИГУЛЕВСКИЙ

Прав. канц. (подпись)

Вось як царызм душыў культуры нацменшасьцяй і праводзіў русіфікатарскую політыку.

Ня ў лепшым становішчы знаходзіўся польскі тэатр. 40 гадоў ён быў забаронены і толькі пад націскам паўстаўшых мас у 1905 годзе польскі тэатр быў часова зноў дазволены. У «Русском слове» № 192, 1905 г. мы знаходзім наступную тэлеграму:

«Менск. Пасьля 40 гадовага перапынку ў гарадзкім тэатры адбыўся спэктакль на польскай мове».

У такіх-жа ўмовах знаходзіўся і яўрэйскі тэатр.

У 1913 г. у Менску панаваў царскі сатрап губарнатар Гірс. Усе культурныя мерапрыемствы ім забараняліся.

У адносінах да яўрэйскага тэатру ён ужываў цыркуляр 17-га жніўня 1883 г., якім яўрэйскі тэатр у Расіі быў забаронены. На ўсе хадайніцтва яўрэйскіх актораў дазволіць ім граць у Менску, Пінску, Бабруйску і іншых гарадох, хаця-бы на ломанай нямецкай мове, атрымоўваўся адзін адказ: «адмовіць».

Але ў той-жа час сіоніцкім організацыям дазвалялася даваць спэктаклі на дрэўне-яўрэйскай мове. Кантар Кварцін даваў концэрты без асаблівага дазволу, бо гэта былі «свае людзі», ад якіх ня можа было чакаць «крамолы». І гэта зусім зразумела. Таму, што ў буржуазіі і духоўніцтва заўсёды былі агульныя інтарэсы, якія былі накіраваны для абмарачваньня мас.

Антрэпрэнёр менскай яўрэйскай трупы А Ліўшыц зьвярнуўся да губарнатара аб дазволе граць у зале «Парыж» і атрымаў вядомую рэзолюцыю: «адмовіць». Ліўшыц зварочваецца да міністэрства ўнутраных спраў, якое перасылае заяву Ліўшыца Гірсу і апошні дае наступны адказ:

В ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ ПО ДЕЛАМ ПЕЧАТИ.

Вследствие отношения от 5-го февраля с-г за № 4035 имею честь уведомить гл. управ. по делам печати, что, отказывая еврейской труппе Лившица в разрешении постановки спектаклей на еврейском жаргоне, я руководствовался: а) циркулярами МВД (по деп. полиции) от 17-го августа 1883 г. за № 1740 (по гл. упр. по дел. печ.) от 19-го февраля 1891 г. за № 927, коими категорически запрещено исполнение пьес на еврейском жаргоне, б ст. ст. 135, 138 уст., продоставляющими администрации право не разрешать устройства тех или других зрелищ и увеселений, если они противны закону или распоражениям правительства и в. практикою Юго-Западного края, находящегося в одинакониях, где театральные представления на жаргоне вообще безусловно запрещаются.

К сему присовокупляю, что антрепренер евр. труппы после запрещения мною спектаклей на жаргоне жаловался на мои действия упр. МВД, на прошение его, по приказанию Еге В. Департ. общ. дел 20-го января 1913 г. за № 2068 передало на мое распоряжение и мною оставлено без последствий, о чем к об'явлено просителю под расписку.

Губернатор, Камергер Высочайшего Двора ГИРС.

Яўрэйскі артыст Файбішаў «прабуе свой лёс» і выяжджае на тым, што ён нядаўна скончыў тэрмін царскай службы і падае наступную заяву:

Его превосходительству Г-ну Мин. Губернатору. Минского мещанина артиста Айзика Бенцияновича Файбишева (по сцене Фабов), прож. в г. Минске по Полицейской ул. в доме Швейделя)

ПРОШЕНИЕ.

Кочив срок действительной военной его Импер. величество службы 5-го ноября 1912 г., я был заблаговременно законтрактован директором евр. нем. труппы, но по высочайшему повелению за благо отечества я был задержан на службе и контракт между директором и мною был нарушен. 13-го марта 1913 г. Высочайшей милостью был уволен з запас, армии, в настоящем моем положении я нуждаюсь и не имею средств в ожидании до 15-го сентября с. г. для заключения контракта с каким-либо директором евр. нем. труппы, так как контракты заключаются лишь с 15-го сентября по 1-ое октября. Я обращаюсь В. П. к вашему великодушию о даровании мне возможности выйти из этого трудного и критического положения, дабы прожить до вышеозначенного числа, т. е. до 15-го сентября с. г. Надеюсь и уверен, что за богом молитва и за царем служба не пропадают, покорнейше прошу В. П. о разрешении мне постановки 5-ти спектаклей на евр. нем. языке в г. Минске и это даст мне возможность прожить до вышеозначенного времени. Пры сем прилагаю рекомендательное свидетельство командира полка и аттестат ротного командира о благонадежности моей.

Айзик Файбишев (по сцене Фабов)

Минск, апреля 1913 г.

Рэзалюцыя Гірса: «Отказать».

Вышэйпаказаныя дакуманты яскрава ілюструюць і асьвятляюць цёмны шлях прыніжэньня, праз які прайшлі яўрэйскі тэатр і яўрэйскія акторы пры царызьме.

Толькі Кастрычнікавая рэволюцыя дала магчымасьць нацыянальнаму мастацтву, бяспраўнаму пры царызьме, расьці і разьвівацца.

Пяць год дасягненьняў

У 1922 г. Наркамасьветы Беларусі камандыраваў групу рабочай моладзі, пад кіраўніцтвам т. Рафальскага ў Маскву з мэтаю ўдасканаліцца ў галіне тэатральнага мастацтва. Група стварыла яўрэйскую сэкцыю пры Беларускай студыі, якая ў той час там працавала. У 1923 г. сэкцыя была перагворана ў самастойную студыю і як гэткая прабыла ў Маскве да 1926 г.

У процэсе ляборторнай работы, студыя таксама рыхтавала свой рэпэртуар, які састаяў з яўрэйскіх і эўропэйскіх клясыкаў (Перэц, Шолом-Алейхем, Мольер, Шэкспір). Колектыў здолеў авуладаць высокай тэатральнай культурай, але аднначасова студыя падпала пад ўплыў некаторых чуждых плыняў. Гэтыя ўплывы выразіліся ў няправільным выбары рэпэртуару выключна клясыкаў, у памылках у мастацкім аформленьні і пастановак—нацыянальная экзотыка, этнографія («На пакаяным ланцугу» «Сьвята ў Кастрылаўцы»), у ідэалістычна-мэтафізычных («Шэйлок») і формалістычна-мэханічных («Скапен») ухілах.

У 1926 г. студыя пераяжджае ў г. Менск і пачынае працаваць пад мастацкім кіраўніцтвам т. Рафальскага, як яўрэйскі Дзяржаўны Тэатр Беларусі. Друк, партыйная і пролетарская грамадзкасьць, рабочы гледач ставяць востра перад тэатрам аб пераключэньні на рэволюцыйную і савецкую тэматыку. Тэатр перабудоўвае сваю работу і робіць паварот да рэволюцыйнага рэпэртуару. Ён уводзіць у свой рэпэртуар творы пролетарскай драматургіі («Ботвін», «Лекерт»), адначасова тэатр змагаецца супроць рэштак студыйнага пэрыоду, але ў некаторых пастаноўках пазьнейшага часу паўтараюцца элемэнты ідэалізму і формалізму.

Усё-ж тэатр становіцца моцна на шляху барацьбы за марксыцка-ленінскі мэтод у тэатральным мастацтве.

За 5 год сваёй працы ДЯТ БССР выхаваў групу рэжысёраў Літвінава, Норда Айзенберга, Галаўчынэра і інш., якія займаюцца кіруючай работай ў шэрагу тэатраў Беларусі. ДЯТ гастраляваў у РСФСР (Масква, Смаленск), у УССР (Кіеў, Харкаў, Адэса, Бердычаў, Нікалаеў, Умань), прымаў удзел ва Усесаюзнай алімпіядзе, дзе ён атрымаў ацэнку, як адзін з перадавых тэатраў у Савецкім Саюзе.

На рубяжы 6-га году тэатр узмацняе сваю работу над проблемай авуладаньня тэхнікай тэатральнага мастацтва, над ідэалёгічна-мастацкай кваліфікацыяй актора, на якім робіцца ўпор ва ўсёй рабоце, над проблемай кадраў. Пры тэатру было створана студыя рабочай моладзі. Тэатр бярэ на сябе абавязкі ісьці далей, пад кіраўніцтвам партыі, па шляху перамогі над усімі цяжкасьцямі, па шляху замацаваньня позыцый і гегемоніі пролетарскага тэатру.

„Штурм", паст. Б. Норда

Х. Дунец

На шляхох бальшавіцкага мастацтва

Яўрэйскаму дзяржаўнаму тэатру БССР споўнілася 5 год. Гэтае пяцігодзьдзе характарызуецца завяршэньнем аднаўленчага пэрыоду ў нашым Савецкім Саюзе і ажыцьцяўленьнем пляноў першых трох год першай пяцігодкі, рэалізацыяй шэрагу важнейшых задач соцыялістычнай рэконструкцыі краіны і перАробкі на соцыялістычны лад сельскай гаспадаркі. Гэтыя гады нябачаных перамог рабочае клясы пад кіраўніцтвам партыі на франтох соцыялістычнага будаўніцтва ў разгорнутым наступе на рэшткі капіталізму па ўсім фронце, зьяўляліся таксама гадамі прасоўваньнем нашай краіны наперад па шляху культурнай рэволюцыі. Яўрэйскі дзяржаўны тэатр БССР зьяўляецца яркім фактарам барацьбы за культурную рэволюцыю і ажыцьцяўленьне ленінскай нац політыкі. Ён народжаны ў савецкіх умовах, выхаваны савецкай грамадзкасьцю, пад кіраўніцтвам партыі, яго касьцяк складаецца з рабочых, комуністаў, комсамольцаў, у яго шэрагах ёсьць шмат ударнікаў. Падводзячы вынікі пяцігадоваму існаваньню тэатра, мы павінны сказаць пра яго дасягненьні, ня змазваючы яго памылак, з тым, каб правільна формуляваць патрабаваньні, якія павінны быць прад'яўлены тэатру.

Ня прыпыняючыся на паасобных момантах, можна каротка сказаць пра наступныя асноўныя этапы работы тэатра.

1. Першы этап—этап, калі ў тэатры адсутнічала неабходная сувязь з рэволюцыйнай практыкай рабочае клясы і былі ў наяўнасьці няскрытычныя адносіны да буржуазнай спадчыны. Гэтыя адмоўныя ўласьцівасьці, якія тэатр ня здолеў у дастатковай ступені перамагчы на сваім першым этапе, сказаліся ў шэрагу пастановак («На пакаяным ланцугу», «Сьвята ў Касрылаўцы», «Шэйлок» ды інш.). Элемэнты яўрэйскага нацыяналізму, неразуменьне клясавай існасьці грамадзкіх процэсаў, дабрадушна - прымірэнчкія адносіны да дробнабуржуазнага местачковага быту, схолястычны адрыў «камернай» работы ад рэволюцыйнай практыкі пролетарыяту, неразуменьне таго, што тэатр зьяўляецца клясавай зброяй і павінен служыць інтарэсам клясавага грамадзтва—вось чым характарызуецца названы этап для тэатру.

Дзякуючы кіраўніцтву партыі і бальшавіцкай самакрытыцы, дзякуючы ўменьню тэатральнага колектыва перабудавацца, гэты пэрыод ня быў для тэатра зацяжным і колектыву ўдалося без асаблівай хваравітасьці перамагчы на-хаду асноўныя памылкі і рушыць далей па шляху рэволюцыйнага росту.

2. Другі этап тэатра можа быць названы этапам, калі тэатр павярнуўся тварам да рэволюцыйнай тэматыкі («Авечая крыніца», «Ботвін», «Лекерт», «Дэр тойбер»). Гэты этап характарызуецца імкненьнем тэатра адмежавацца ад тлумачэньня грамадзкага жыцьця з пункту погляду нацыяналістычна-местачковай ідыліі, імкненьнем ператварыць у вобраз на сцэне рэволюцыйныя эпохі, рэволюцыйны рух мас. Гэта—станоўчая зьява, але гэтыя першыя крокі не маглі яшчэ ў дастатковай ступені задаволіць савецкага глядача. Бо гэта тэматыка ў аснове сваёй хутчэй была вылазкай у рэволюцыйнае мінулае, чым непасрэдны адказ на патрабаваньні адлюстраваньня рэчаіснасьці соцыялістычнай будоўлі. Гэтым, безумоўна, ні ў якім разе не адмаўляюцца вялікія заслугі тэатру, які першы з яўрэйскіх тэатраў СССР здолеў стварыць рэволюцыйны вобраз, паказаць больш ці менш правільна трактоўку рэволюцыйных процэсаў у масе яўрэйскіх рабочых і працоўных, так як яны павінны былі быць у сьвятле бальшавіцкага разуменьня гісторыі рэволюцыйнага руху. Гэта асабліва трэба падкрэсьліць у адносінах да пастаноўкі «Лекерт», у якой узрываецца хвасьціцкая, нацыяналістычная сутнасьць бундоўскай партыі. Аднак гэты этап быў толькі пачаткам пераходу на вышэйшую ступень, але ня трымаў яшчэ ў сабе асновы асноў—сувязі задач тэатра і яго работы з рэволюцыйнай практыкай пролетарыяту. Што тычыцца адносін да папярэдняга этапу, дык у гэтых пастаноўках праявілася як сіла таксама і слабасьць тэатру: бо калі «Авечая крыніца» выражае сабою удалую спробу перамаганьня спадчыны, дык «Глухі» выражае рэцыдывы неперамоўжанай нацыяналістычнай абмежаванасьці.

3. Трэці этап можа быць названы этапам знамянаўчых імкненьняў тэатру да ажыцьцяўленьня задачы—тварам да рэволюцыйнай практыкі. Пастаноўкі «Барацьба машын», «Гоцля, жывём», «Джым Куперкоп» зьяўляюцца першымі спробамі тэатра адлюстраваць процэсы соцыялістычнага будаўніцтва і нарастаньня рэволюцыйнага крызісу і краху капіталізму. Гэтыя пастаноўкі маюць цэлы шэраг сур'ёзных памылак як з пункту гледжаньня літаратурных матырыялаў, так і тэатральнага аформленьня, у іх было шмат ідэолёгічных зрываў, аднак, імкненьне тэатру стаць на шлях адлюстраваньня сучаснай рэволюцыйнай практыкі тут выступіла досыць ярка.

4. І апошні этап—гэта этап, калі тэатр рашуча павярнуўся тварам да пэрыоду соцыялістычнай рэконструкцыі краіны. Пастаноўкі «Стрэл», «На 62-м вучастку», «Штурм», «Поэма пра сякеру»—ня гледзячы на тое, што не адна з гэтых пастановак не пазбаўлена тых ці іншых сур'ёзных зрываў і памылак, характарызавалі сабою імкненьне тэатра стаць бліжэй да проблем рэконструкцыі, колгаснага будаўніцтва і ліквідацыі апошняй капіталістычнай клясы ў краіне.

Калі да гэтага дадаць, што шэраг названых пастановак маюць таксама элемэнты барацьбы з нарастаючай ваеннай небясьпекай (да ліку гэтых пастановак варта аднесьці апошнюю пастаноўку тэатра «Партызаны»), дык перад намі паўстане карціна напружанай работы тэатра па авалоданьні тэматыкі пэрыоду соцыялістычнай рэконструкцыі і нарастаньня рэволюцыйнага крызісу ў капіталістычных краінах.

На гэтай аснове варта біз усякай напускной ўрачыстасьці гаварыць пра вялікія дасягненьні тэатра. Тэатр у асноўным пасьпяхова змагаўся з нацыяналістычным уплывам. У процэсе работы над аформленьнем рэволюцыйнай і соцыялістычнай тэматыкі выраслі творчыя сілы тэатра, аформіўся творчы твар перадавой групы тэатральнага колектыву, вырас кадр кіруючых работнікаў тэатра на чале з мастацкім кіраўніком т. Рафальскім. У процэсе работы над рэволюцыйнымі пастаноўкамі выраслі такія таленавітыя рэжысэры тэатра, як т.т. Літвінаў, Норд, Айзенберг ды інш., выраслі акторы тэатра.

Што тэатр дасягнуў у галіне разгортваньня творчых сіл актораў? Трэба сказаць, што ў гэтым сэнсе дасягненьні ішлі галоўным чынам ўшырыню.

Актор за пэрыод пяці год абагаціўся вопытам работы над розным матэрыялам, ён зрабіў першыя спробы ажыцьцявіць у тэатры вобраз соцыялістычнага будаўніка—рабочага, колгасьніка, вобраз партызана і г. д.; ён навучыўся орыентавацца ў цэлым шэрагу сітуацый і абставін рэволюцыйнай барацьбы і соцыялістычнага будаўніцтва, ён, урэшце, атрымаў магчымасьць выйсьці за межы вузка-нацыянальнага тыпажа і нацыянальнага асяродзьдзя і павялічыць свой вопыт, пашырыць свой кругагляд, разглядаць процэсы нашае барацьбы на шырокай арэне СССР і міжнароднага пролетарыяту. Аднак, глыбокім пранікненьнем у гэтыя сітуацыі і ў стварэньні вобразу работнікі тэатру ня могуць пахваліцца. Гэта агульнае зьявішча. Тут патрабуецца бальшавіцкая перабудова мастацкага кіраўніцтва тэатра, энэргічная самокрытычная работа, праверка ў сьвеце самокрытыкі ўсяго пройдзеннага шляху, правільнае рэагаваньне справай на ўказаньні пролетарскай грамадзкасьці і друку, сапраўдная барацьба з элемэнтамі нацыяналізму, буржуазнага формалізму, паўзучага эмпірызму і схэматызму, каторыя зьяўляюцца вынікам неперамоўжных чужых уплываў ў творчым мэтодзе тэатра.

Асноўная, як нам здаецца, задача тэатра на даным этапе гэта—барацьба за павышэньне якасьці сваёй продукцыі, барацьба за авалоданьне і ўдасканаленьне тэхнікай акторскай справы на аснове марксыцка-ленінскай вучобы. У гэтым сэнсе тэатр перажывае крызіс росту, работнікі тэатру ставяць сабе павышаныя патрабаваньні ў галіне якасьці. Неабходна шэрагам мерапрыемстваў прыйсьці на дапамогу тэатру, каб ён найбольш пасьпяхова ўзьняўся на вышэйшую ступень.

Асабліва неабходна вырашыць проблему паглыбленай тэорэтычнай і практычнай работы з акторам, з кожным у паасобку, з тым, каб выявіць усе потэнцыі актораў, даць ім максымальна разгарнуцца, выявіць здольнасьць тэй часткі актораў, якая пакуль што застаецца ў цяні. Для таго. каб гэтую асноўную задачу вырашыць, неабходна тэатру на справе ажыцьцявіць шэсьць умоў тав. Сталіна, ліквідаваць абязьлічку, зьнішчыць цякучасьць, змагацца з ураўнілаўкай, правільна ажыцьцявіць адзінаначальле, разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, шырака разгарнуць бальшавіцкую крытыку і самакрытыку. Організацыйнае ўзмацненьне тэатра павінна быць адной з турбот адпаведных кіруючых устаноў. Неабходна больш увагі аддаць стварэньню кадраў, больш клапаціцца аб аб'яднаньні кадраў драматургаў вакол тэатра, неабходна рашуча вывесьці з тэатру ўпадачныя настроі і панікёрства, элемэнты праваопортуністычнай практыкі і г. д.

Дасягненьні тэатра ня могуць быць недаацэнены. Гэтыя дасягненьні асабліва ярка вылучаюцца ў прыватнасьці на фоне стану яўрэйскай культуры ў краінах фашызму і капіталізму. Ня даўна яўрэйскі друк замежжа абышла вестка пра тое, што ўсе лепшыя яўрэйскія тэатры ў Амэрыцы зачыніліся. У варшаўскім яўрэйскім друку на працягу цэлага пэрыоду дыскусавалася пытаньне пра крызіс яўрэйскага тэатру, прычым уся гэтая дыскусія мела сваёй задачай хаця пустазвонымі словамі разрадзіць атмосфэру, створаную ў сувязі з ліквідацыяй шэрагу культурных, у тым ліку і тэатральных устаноў. Калі паглядзець на тое, што зьяўляецца зараз асноўным матэрыялам пастановак яўрэйскіх тэатраў за мяжой, дык ня цяжка ўбачыць, што гэты матэрыял ідзе ці з чыста лахтурных бульварных крыніц, ці—ў больш сур'ёзных тэатрах—з крыніц містычнага мракабесься... Вось чым яўрэйскі тэатр за мяжой жывіць свайго гледача. Няма чаго казаць, што яўрэйскі дзяржаўны тэатр у БССР па зьмесьцу сваёй работы, па сваіх імкненьнях, па сваіх пэрспэктывах зьяўляецца фактарам цалкам супроцьлеглым гэтым расаднікам буржуазнай культуры, фактарам, заклікаым узарваць гэтыя ачагі буржазнай і клерыкальнай культуры.

Уступаючы ў другое пяцігодзьдзе свайго існаваньня, яўрэйскі дзяржаўны тэатр БССР павінен праверыць у сьвятле глыбокай крытыкі і самакрытыкі свой пройдзены шлях, з тым, каб канчаткова ліквідаваць элемэнты буржуазнага, дробнабуржуазнага і нацыяналістычнага ўплыву, каб прасякнуць соцыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам усю сваю работу і каб, кіруючыся паказаньнямі партыі, ісьці далей наперад, стаць у шэрагі лепшых змагароў за бальшавіцкае мастацтва.

На ўзровень новых задач

Уступленьне СССР у пэрыод рэконструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, разгорнуты наступ соцыялізму на капіталістычныя элемэнты на ўсім фронце патрабавалі рашучай перабудовы мэтадаў і форм работы і кіраўніцтва ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва. Задача і характар перабудовы работы па-новаму з выключнай тэорэтычнай глыбінёй і гранічнай яснасьцю былі абсяраваны і выкладзены ў прамове т. Сталіна «Новая абстаноўка, новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва».

Патрабаваньні партыі перабудавацца ў адпаведнасьці з новымі задачамі соцыялістычнага будаўніцтва тычацца ня толькі гаспадарчых організацый. Гэта тачыцца цалкам усіх організацый, усіх вучасткаў соцыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку і ідэолёгічнага фронту.

У галіне ідэолёгічнай партыя правяла рашучую барацьбу з варожымі марксызму-ленінізму тэорыямі. Выкрыты і разьбіты рубіншчына, мэханіцызм і меншавіствуючы ідэалізм, антымарксыцкія тэорыі на аграным фронце, пераверзеўшчына, літфрантоўшчына ды інш. Ліст т. Сталіна ў рэдакцыю «Пролетарской рэволюцыі» дае сакрушальную крытыку трацкісцкіх контрабандыстаў, рэвізіяністаў усіх адценьняў і гнілога лібэралізму ў пытаньні гісторыі бальшавізму. Ён адыграў важнейшую ролю ў пасіленьні партыйнай дбайнасьці ў адносінах вылазак клясавага ворага і яго агентуры на ўсім ідэолёгічным фронце.

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка «Пра перабудову літаратурна-мастацкіх організацый» мае буйнейшае значэньне для гэтага фронту, карэнным чынам і конкрэтна ставіць пытаньне пра перабудову ў адпаведнасьці з новымі задачамі літаратурна-мастацкіх організацый, якія больш чым іншыя організацыі зацянулі перабудову, моцна адстаўшы ад тэмпаў і патрабаваньняў, што прад'яўляюцца да іх самім жыцьцём.

Вырашальныя посьпехі соцыялізму за апошнія гады выклікалі рашучы пераход пераважнай большасьці старой тэхнічнай інтэлігенцыі на бок савецкай улады, адкрыты і пасьлядоўны пераход на гэтыя-ж позыцыі буйнейшых вучоных краіны, што аддаюць свае багатыя веды справе соцыялізму, што выразілася ў прыватнасьці ў павароце Усесаюзнай акадэміі навук да распрацоўкі актуальных задач соцыялістычнага будаўніцтва.

У галіне літаратуры гэты паварот характарызуецца актыўным удзелам шырокіх пісьменьніцкіх кадраў, што стаяць на пляцформе савецкай улады, у соцыялістычным будаўніцтве, што знайшло сваё адлюстраваньне ў іх мастацкай творчасьці (Л. Леонаў, М. Ціханаў, М. Шагіняя, Малышкін, ды інш.).

Пятнаццаць год пролетарскай дыктатуры прылучылі да навукі, тэхнікі, літаратуры і мастацтва дзесяткі і сотні тысяч рабочых і сялян. Значна вырасьлі «КАДРЫ ПРОЛЕТАРСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА. ВЫЛУЧЫЛІСЯ НОВЫЯ ПІСЬМЕНЬНІКІ І МАСТАКІ З ЗАВОДАЎ, ФАБРЫК, КОЛГАСАЎ». Маркс і Ленін заўсёды падкрэсьлівалі, тое, што сапраўды невычэрпаемы таленты ў гушчыні народных мас. Гэтыя таленты гінулі і гінуць у краінах капіталізму. У нас-жа, у краіне пролетарскай дыктатуры, створана магчымасьць бязьмежнага росквіту і росту творчых сіл ва ўсіх галінах культуры для самых шырокіх мас працоўных.

У сьвятле посьпехаў соцыялізму, росту новых кадраў пролетарскай інтэлігенцыі, павароту на позыцыі соцыялізму старой інтэлігенцыі гістарычнае значэньне мае пастанова ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка. Яна ўскрывае рост нашай літаратуры і мастацтва, з надзвычайнай выразнасьцю паказвае выяўленьне і ўздым творчых сіл з гушчыні працоўных, вызначае конкрэтныя шляхі далейшых заваёў.

Пастанова ЦК знаходзіцца ў шчыльнейшай сувязі з мерапрыемствамі партыі, накіраванымі на тое, каб навуку і тэхніку зрабіць здабыткам найшырэйшых мас працоўных. Яна будзе садзейнічаць далейшаму росквіту літаратуры і мастацтва ў Савецкім Саюзе.

«Некалькі год таму назад, калі ў літаратуры ў наяўнасьці былі яшчэ значныя ўплывы варожых элемэнтаў, што асабліва ажывіліся ў першыя гады НЭП'у, а кадры пролетарскай літаратуры былі яшчэ слабымі, партыя ўсямерна дапамагала стварэньню і ўмацаваньню адмысловых пролетарскіх організацый у галіне літаратуры і мастацтва з мэтаю ўмацаваньня позыцый пролетарскіх пісьменьнікаў і працаўнікоў мастацтва (з рэзолюцыі).

Гістарычнам зусім неабходным было існаваньне на гэтым этапе асобных пролетарскіх організацый у галіне мастацтва і літаратуры. Але за апошні час, у сувязі з новай абстаноўкай ў краіне і новымі задачамі, што стаяць перад літаратурай і мастацтвам, РАПП з організацыі, якая садзейнічае росту літаратуры і мастацтва, стала ператварацца ў сваю супроцьлегласьць. «Рамкі існуючых пролетарскіх літаратурна-мастацкіх організацый (ВОАПП, РАПП, РАМП, ды інш.) становяцца ўжо вузкімі і тармозяць сур'ёзны размах мастацкай творчасьці. Гэтая акалічнасьць стварае небясьпеку ператварэньня гэтых організацый са сродкаў найбольшай мобілізацыі савецкіх пісьменьнікаў і мастакоў навокал задач соцыялістычнага будаўніцтва ў сродак культываваньня гурткавой замкнутасьці, адрыву ад політычных задач сучаснасьці і ад значнай групы пісьменьнікаў і мастакоў, што спачуваюць соцыялістычнаму будаўніцтву».

Організацыйная структура літаратурна-мастацкіх організацый не адпавядае новай абстаноўцы і задачам літаратуры. Гэтая акалічнасьць усугублялася няўжытымі яшчэ, наўпрэкі простым паказаньням партыі, элемэнтамі групаўшчыны, гурткавой замкнутасьці і недастатковай самокрытыкі. Групавая замкнутасьць, падмена ідэёва-выхаваўчай работы адміністраваньнем са дзейнасьці таксама адрыву РАПП ад пэўнай часткі пролетарскіх пісьменьнікаў.

Неабходна таксама ўлічыць, што далейшаму разьвіцьцю літаратуры перашкаджаюць многія памылкі ў тэорэтычных і творчых выказваньнях некаторых кіруючых працаўнікоў РАПП, памылкі, да гэтага часу даканца неўскрытыя ў моц часам далёка-няпрынцыповых меркаваньняў.

Да ліку найбольш яркіх памылак творчага парадку адносіцца стаўка на індывідуальны псыхолёгізм. Выходзячы з гэтага, разьвівалася ідэалістычная тэорыя «жывога чалавека», найбольш поўна сформуляваная ў тэзісе: «СЬВЕТ—ГЭТА ЧАЛАВЕК». Гэты вынік шчыльна быў зьвязаны з такой мэтолёгічнай устаноўкай: «Аналіз чсыхолёгіі ІНДЫВІДУАЛЬНАЙ зьяўляецца лепшым шляхам літаратуры да разуменьня псыхолёгіі СОЦЫЯЛЬНАЙ». (Гл. Аўэрбах—«Пра задачы пролетарскай літаратуры»).

Але гэта РОБІНЗОНАДА ня мае нічога агульнага з марксызмам. Зразумець псыхолёгію паасобных асоб можна толькі праз аналіз ГРАМАДЗКІХ адносін, прадуктам якіх яны зьяўляюцца.

«Соцыолёг-матэрыяліст, які робіць прадметам свайго вывучэньня пэўныя грамадзкія адносіны людзей, тым самым ужо вывучае і рэальных АСОБ, з дзейнасьцяў якіх і складаюцца гэтыя адносіны. Соцыолёг-суб'ектывіст, пачынаючы свае разважаньні нібыта з «жывых асоб», на самой справе пачынае з таго, што ўкладае ў гэтых асоб такія «помыслы і пачуцьці», якія ён лічыць рацыянальнымі (таму што, ізалюючы сваіх «асоб» ад конкрэтнай грамадзкай абстаноўкі, ён тым самым адняў у сябе магчымасьці вывучаць сапраўдныя іх помыслы і пачуцьці), гэта значыць, «пачынае з ўтопіі» (ЛЕНІН, Т. I СТАР. 208).

Тэорэтычныя ізмышленьні пра індывідуальны псыхолёгізм, як наш курс у літаратуры, у прынцыпе супярэчыць МЭТОЛЁГІЧНЫМ устаноўкам Леніна і непазьбежна вядуць да адрыву ад актуальных проблем соцыялістычнага будаўніцтва і клясавай барацьбы, што цудоўна дэмонструецца ў некаторых романах, у асаблівасьці у «Рождении героя».

Няленінскія ўстаноўкі ў пытаньнях творы культуры сказаліся і на крытыцы і на мастацкай творчасьці. Крытыка стаіць, як правіла, на дужа нізкім тэорэтычным узроўні, яўна адстае ад мастацкай творчасьці. Калі ў літаратуры мы маем за апошні час значныя мастацкія творы («Клим Самгин»—М. Горкага, «Разгром»—Фадзеева, «Бруски»—Панфёрава, «Разбег»—Стаўскага ды інш.), дык нельга гаварыць пра аналёгічныя посьпехі ў галіне літаратурнай крытыкі.

ГРУБЫЯ ПОЛІТЫЧНЫЯ ПАМЫЛКІ ДАПУШЧАНЫ І Ў АДНОСІНАХ ДА СПАДАРОЖНІКАЎ. На старонках кіруючага часопісі На литературном посту» у шэрагу артыкулаў культывалася яўна «лявацкая» ўстаноўка—«НЕ СПАДАРОЖНІК, А САЮЗЬНІК ЦІ ВОРАГ» (№ 2—1931 г.). Яўна недазумеючы процэсу павароту пісьменьнікаў, часопісь выстаўляе лёзунг: «САЮЗЬНІК, ЦІ ВОРАГ»—ВОСЬ АСНОЎНАЯ ПАСТАНОЎКА ПЫТАНЬНЯ, ЯКУЮ МЫ ДАЕМ ЦЯПЕР». (№ 11—1931 г.).

Разьвіваючы гэтую няправільную ўстаноўку часопісі, Аўэрбах намагаўся падвесьці пад яе тэорэтычную базу. Схэматызуючы і вульгарызуючы лінію партыі ў адносінах інтэлігенцыі, ён піша: «Ісьці сёньня з рэволюцыяй—інакш кажучы, значыць быць упэўненым у «магчымасьці» пабудовы соцыялізму ў нашай краіне. Да тых, хто ідзе з рэволюцыяй, ці падыходзіць назва «спадарожнік»,—хіба гэта не саюзьнікі. Усе астатнія савецкія пісьменьнікі, не падагнаныя пад гэтую формулу, адкідаюцца ў лягер контррэволюцыі: «...хіба гэта не супраціўнік, ня вораг, не агентура клясавага ворага?» («Из РАППОВСКОГО ДНЕВНИКА»).

Так, мэтадамі голага адміністраваньня вырашаецца проблема «спадрожніцтва». Задачы пераробкі і перавыхаваньня спадарожнікаў здымаюцца. Але такая пастаноўка пытаньня Ў ПРЫНЦЫПЕ СУПЯРЭЧЫЦЬ ЛІНІІ ПАРТЫІ. Апошняя пастанова ЦК пра перабудову літаратурна-мастацкіх організацый усім сваім вастрыём накіравана супроць «лявацкага» вульгазатарства, упрашчэнства, у адносінах да спадарожнікаў, што стаяць на пляцформе савецкай улады.

Партыя неадназова давала кіраўніцтву РАПП паказаньні пра неабходнасьць рашучай перабудовы сваёй работы, набліжэньне яе да задач соцыялістычнага будаўніцтва. Шмат разоў паказвалася, на тое што РАПП—не адміністрацыйная, а ідэёва—выхаваўчая організацыя. Паказвалася на неабходнасьць разгортваньня самакрытыкі, на неабходнасьць з'яднаньні ўсіх сіл пролетарскай літаратуры і крытыкі на прынцыповых позыцыях. Аднак, усе гэтыя простыя і непасрэдныя паказаньні партыі ў значнай ступені ня былі выкананы.

Вось чаму так своечасова пастанова ЦК пра ліквідацыю РАПП і ВОАПП —пра аб'яднаньне ўсіх пісьменьнікаў, што падтрымліваюць пляцформу савецкай улады і імкнуцца ўдзельнічаць у соцыялістычным будаўніцтве, у адзіны саюз савецкіх пісьменьнікаў з комуністычнай фракцыя у ім. Пастанова ЦК дасьць рашучы штыршок ліквідацыі групавай адасобленасьці, гурткавой замкнутасьці, элемэнтаў сямейнасьці і неаб'ектыўнасьці крытыкі. Пісьменьнікі, што спачуваюць соцыялістычнаму будаўніцтву, сумесна з пролетарскімі пісьменьнікамі увойдуць у АДЗІНЫ САЮЗ САВЕЦКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ. Ствараюцца ўмовы для ўзьняцьця мастацкай літаратуры на больш высокую ступень, для сапраўды прынцыповай, разгорнутай барацьбы з антыпролетарскімі, опортуністычнымі тэндэнцыямі і плынямі ў мастацкай літаратуры і мастацтве.

Перад саюзам савецкіх пісьменьнікаў і яго комуністычнай фракцыяй стаіць вялізарнай важнасьці задача—стварэньне высока-мастацкай, соцыялістычнай па свайму зьместу, літаратуры. Саюз пісьменьнікаў павінен будзе забясьпечыць такія ўмовы творчасьці, выхаваць такія кадры, каб у недалёкім будучым змагла зьявіцца літаратура, сапраўды вартая нашай вялікай эпохі, вартая клясы, героічна ажыцьцяўляючай пабудову новага, бесклясавага грамадзтва.

Лёзунг—за соцыялістычную літаратуру, за магнітабуды ў літаратуры—павінен стаць штандарам саюзу пісьменьнікаў. Пролетарыят пад кіраўніцтвам компартыі будуе соцыялізм, стварае соцыялістычную культуру. Літаратура ёсьць частка агульнага фронту культурнага будаўніцтва. Пролетарская літаратура, што правільна адлюстроўвае соцыялістычныя адносіны, якія склаліся і складаюцца, бясспрэчна па сваёй сутнасьці зьяўляецца соцыялістычнай. Аднак няправільна поўнае атаежсамленьне пролетарскай літаратуры эпохі пераходнага пэрыоду, соцыялістычнай па сваёй сутнасьці, з літаратурай соцыялістычнага грамадзтва.

Перад саюзам савецкіх пісьменьнікаў паўстаюць вялізарнейшыя задачы ў сувязі з доўгай пяцігодкай. Важнейшай політычнай задачай другой пяцігодкі зьяўляецца ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, пабудова бяскласавага соцыялістычнага грамадзтва, ператварэньне ўсіх працоўных ў актыўных і сьвядомых будаўнікоў соцыялізму. Пісьменьнікі павінны асэнсіць усе процэсы барацьбы пролетарыяту за зьнішчэньне клясаў і за пабудову соцыялізму ва ўсёй іх конкрэтнасьці і супярэчлівасьці. Мастак павінен даць ня голую схэму барацьбы і будаўніцтва, а абавязаны паказаць дыялектыку жыцьця, барацьбы і будаўніцтва, цяжкасьці на гэтым шляху і іх героічнае пераманьне, мастак павінен ўсё гэта паказаць на конкрэтных прыкладах, узьнімаючыся ў сваіх абагуленьнях да вышынь філёзофскай мыслі марксызму-ленінізму.

Зрабіць-жа гэта магчыма, няўстанна працуючы над засваеньнем філёзофскіх асноў марксызму-ленінізму, зразумеўшы і ўцаляваўшы ў сваёй творчасьці ўсю моц, магутнасьць ўўсебаковасьць праўды марксавай дыялектыкі. Вопыт соцыялістычнага будаўніцтва ўжо настолькі багаты, соцыялізм ужо у такой ступені пранік у штодзеннае жыцьцё, у работу, у адносіны паміж людзьмі, што ёсьць усе дадзеныя, каб пісьменьнік валодае мэтадам матэрыялістычнай дыялектыкі, для мастацкага праніненьня ў будучыню, якое будуецца сёньня.

Саюз савецкіх пісьменьнікаў справіцца з гэтымі задачамі толькі пры абавязковай умове, што яго кадры самым актыўным чынам уключацца ў штодзенную барацьбу за соцыялізм на ўсіх яе вучастках.

Жорсткая клясавая барацьба, якую пролетарыят вядзе на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва, ня можа быць абыйдзена савецкімі пісьменьнікамі. Яны павінны паказаць гэтую барацьбу ў мастацкай форме, як актыўны і непасрэдныя ўдзельнікі барацьбы. Толькі ў гэтым выпадку яны могуць даць мастацкі-мотываваныя творы, даць сапраўды мастацкае адлюстраваньне рэчаіснасьці, даць творы высокай мастацкай якасьці, клясавай насычанасьці і ідэолёгічнай вытрыманасьці.

Паказаць у мастацкай творчасьці ролю комуністычнай партыі ў будаўніцтве соцыялізму, ператварыць у мастацкае палотнішча яе слаўную і неўпаўторную гісторыю, даць герояў далёкага мінулага, герояў грамадзянскай вайны, герояў сёнешняга дню—перадавікоў-ударнікаў, ударных і гасразьліковых брыгад, колгасьнікаў, што вядуць актыўную барацьбу з кулацтвам за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, комсамольскіх і комуністычных ячэяк—што можа быць на сіле падзей для мастака больш багатым за гэта?

Перад саюзам, асабліва перад яго комуністычнай часткаю, стаіць задача весьці правільную лінію ў адносінах спадарожнікаў, усямерна прыцягваючы іх на бок пролетарыяту, уцягваючы іх у актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве, дапамагаючы ім авалодваць макрсыцка-ленінскай мэтадалёгіяй, адначасова даючы рашучы адпор клясавым ворагам у галіне літаратуры.

Значна шырэй па зьместу і размаху, чым да гэтага часу, стаць задача ўцягненьня і выхаваньня новых пакаленьняў пролетарскіх пісьменьнікаў і мастакоў з перадавікоў-ударнікаў, рабочых і колгасьнікаў.

У супроцьлегласьць замкнутай групаўшчыне і навязваньня думкі той ці іншай літаратурнай групоўкі ўсім пісьменьнікам у саюзе пісьменьнікаў павінна знайсьці месца спаборніцтва творчых напрамкаў і плыняў, сапраўды прынцыповая крытыка варожых пролетарыяту тэндэнцый у мастацкай літаратуры.

Дужа адказная задача ўскладаецца на літаратурную крытыку. Крытык павінен дапамагаць пісьменьніку ўзьняцца на больш высокую ступень творчасьці. Крытыка гэта можа зрабіць, калі самі крытыкі сур'ёзна паставяць перад сабой задачу тэорэтычнай вучобы.

Пад штандарам барацьбы за генэральную лінію партыі, на аснове ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве і барацьбе з клясавымі ворагамі і опортуністамі ўсіх адценьняў, на прынцыпах высокай ідэёвасьці, уцягненьня і прылучэньня да творчай дзейнасьці найшырэйшых працоўных мас адзіны саюз савецкіх пісьменьнікаў, як атрад культурнай соцыялістычнай рэволюцыі, пойдзе да новых вырашальных посьпехаў!

(«Правда» ад 9 мая 1932 г.).

У рэдакцыю газэты паступілі водгукі на пастанову Ц.К. УсеКП(б) ад тт. Зарэцкага, Шапавалава, Ц. Гартнага, Дудара і многіх другіх пісьменьнікаў. З прычыны абмежаванасьці мейсца, яны будуць надрукаваны ў наступным нумары.

Уступаем ў новы гістарычны этап

(Рэзолюцыя комуністычнай фракцыі пісьменьніцкіх аб'яднаньняў)

1. Посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва, правільнае і пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне комуністычнай партыяй Беларусі ленінскай нацполітыкі абумовілі пасьпяховае разьвіцьцё беларускай савецкай літаратуры і літаратур нацменшасьцяй БССР.

Беларуская савецкая літаратура расла ў змаганьні супроць уплываў буржуазнае і кулацкае ідэолёгіі, у змаганьні супроць уплываў контррэволюцыйнага беларускага і мясцовага шовінізму і вялікадзяржаўніцтва. Змаганьне партыі супроць беларускага нацдэмократызму і супроць вялікадзяржаўнага расійскага шовінізму, галоўнае небясьпекі на дадзеным этапе, азначала рашучы паварот асноўных мас беларускае савецкае інтэлігенцыі да задач соцыялістычнага будаўніцтва.

У літаратуры гэта выявілася ў рашучым павароце да задач соцыялістычнага будаўніцтва ў творчасьці асноўнае масы савецкіх пісьменьнікаў.

2. Сход фракцыі пісьменьніцкіх аб'яднаньняў адзначае, што БелАПП за адносна невялікі тэрмін свайго існаваньня адыграла вялікую ролю ў змаганьні пад кіраўніцтвам компартыі за беларускую савецкую літаратуру; у справе вылучэньня і выхаваньня новых кадраў пролетарскіх пісьменьнікаў.

Аднак сёньня, калі пасьпелі ўжо вырасьці значныя кадры беларускае пролетарскае літаратуры, організацыйныя рамкі БелАПП'у як і ўсяе ВОАПП, становяцца вузкімі і тармозяць далейшы пасьпяховы размах мастацкай савецкай літаратуры. Гэта стварае небясьпеку ператварэньня АПП са сродка найбольшай мобілізацыі савецкіх пісьменьнікаў вакол задач соцбудаўніцтва, у сродак культываваньня гуртковай замкнёнасьці, адрыву ад політычных задач сучаснасьці і ад значных груп пісьменьнікаў, якія імкнуцца ўдзельнічаць у соцыялістычным будаўніцтве.

Кіраўніцтва БелАПП перабудову работы адпаведна новым задачам і патрабаваньням партыі праводзіла надзвычайна марудным і тэмпамі. Часам сапраўдная перабудова падмянялася дэклярацыямі. Мела мейсца захаваньне гуртковай замкнёнасьці, групаўшчыны, элемэнты адміністраваньня і заціскаваньня самакрытыкі. Былі дапушчаны грубыя памылкі ў адносінах да спадарожнікаў. Кіраўніцтва ў адносінах да паасобных спадарожнікаў падмянялася часам адміністрацыйным окрыкам і наклейваньнем рознага роду ярлыкоў.

Слаба ажыцьцяўляючы неаднаразовыя паказаньні партыі пра перабудову работы, кіраўніцтва БелАПП не навярнулася тварам да творчых задач, вынікам чаго зьявілася далёка недастатковае разгортваньне творчых груп, чым па сутнасьці тармазілася гэтая работа.

3. Вітаючы гістарычную пастанову ЦК УсеКП(б) пра перабудову літаратурна-мастацкіх організацый, фракцыя комуністаў лічыць, што гэтая пастанова забясьпечвае далейшы нябывалы рост савецкае літаратуры ўсіх народаў СССР і ў зьвязку з гэтым ставіць перад комуністамі, якія працуюць у галіне літаратуры, рад складаных і адказьнейшых задач.

Галоўнай задачай комуністаў, якія працуюць на фронце мастацкае літаратуры, зьяўляецца далейшае пасіленьне змаганьня, сумесна з асноўнай масай савецкіх пісьменьнікаў, за бальшавіцкую партыйнасьць мастацкае літаратуры, супроць клясава-чужых тэорый і ўплываў, за высокі ідэёвы мастацкі ўзровень савецкае літаратуры, за разгортваньне шырокага спаборніцтва розных творчых груп і плыняў, за яшчэ большую мобілізацыю ўсяго фронту савецкае літаратуры БССР на змаганьне за соцыялістычнае будаўніцтва.

Комуністычная фракцыя Адзінага Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў Беларусі павінна будзе, ажыцьцяўляючы гэтыя задачы, разгарнуць самае рашучае змаганьне, як з тэндэнцыямі перанясеньня ў новую організацыю элемэнтаў групаўшчыны, гурткавой замкнутасьці і заціскаваньня самакрытыкі, так і з рэакцыйна-абыватэльскімі і рэваншысцкімі настроямі паасобных пісьменьнікаў.

4. Перабудова работы літаратурна-мастацкіх організацый ні ў якім разе не павінна паслабіць работы з закліканымі ў літаратуру рабочымі-ўдарнікамі, а наадварот павінна стварыць усе ўмовы для далейшага рашучага вылучэньня ў літаратуру новых кадраў з рабочае клясы і колгасьнікаў.

Савецкія пісьменьнікі БССР пра пастанову ЦК УсеКП(б)

Савецкія пісьменьнікі БССР шчыра вітаюць пастанову ЦК УсеКП(б) пра перабудову літаратурна - мастацкіх організацый, якая дае новыя нябачаныя пэрспэктывы і магчымасьці для разьвіцьця савецкае літаратуры, да поўнага, усебаковага і глыбокага ўдзелу ў будаўніцтве соцыялізму нашае краіны.

Савецкія пісьменьнікі БССР пад кіраўніцтвам бальшавіцкае партыі будуць рабіць усе захады для таго, каб наша літаратура тварыла творы пра эпоху вялікшае ідэёвае і мастацкае вартасьці, рэволюцыйныя пісьменьнікі БССР будуць змагацца за бальшавіцкае мастацтва, даючы жорсткі адпор усякім буржуазным праявам, мобілізуючы кожнае сваё слова на справу соцыялістычнага будаўніцтва і на стварэньне бесклясавага грамадзтва.

Гістарычная пастанова, якая гаворыць пра значны рост пролетарскае літаратуры, паказвае на тое, што сучасныя організацыйныя рамкі пролетарскіх літаратурных аб'яднаньняў становяцца сур'ёзным тормазам для размаху мастацкае творчасьці і небясьпекаю адрыву пролетарскіх літаратурных організацый ад значных колаў савецкіх пісьменьнікаў.

Мы ўпэўнены, што новаствораны Саюз Савецкіх Пісьменьнікаў забясьпечыць усе магчымасьці для глыбокае і органічнае творчае работы, будзе створана атмосфэра таварыскае крытыкі і самакрытыкі, будуць поўна разгорнуты творчыя плыні ўнутры саюзу, будзе праведзена змаганьне з групавою заўкнёнасьці, групаўшчынаю і інш.

Савецкія пісьменьнікі ўпэўнены, што пастанова ЦК УсеКП(б) будзе магутным стымулам для кожнага пісьменьніка ў яго штодзённай рабоце, накіраванай на апраўданьне таго давер'я, якое ёсьць да нас з боку ленінскай партыі.

Няхай жыве комуністычная партыя!

Няхай жыве правадыр міжнароднага пралетарыяту тав. Сталін!

Мацуем сувязь з пролетлітаратурай капіталістычных краін

Літаратурнаму гуртку завода імя Варашылава, гор. Менск

Ляйпцыг 30-III 32 года

Дарагія таварышы!

Ваш ліст ад 10-II 32 г., адрасаваны рэволюцыйным пісьменьнікам Нямеччыны, мы атрымалі, за які шчыра дзякуем.

Вы напэўна ведаеце, што пролетарская, рэволюцыйная літаратура Нямеччыны ўжо дастаткова вялікая. Сотні пісьменьнікаў, выхадцаў з заводаў і работнікаў разумовае працы, мастацкім словам пропагандуюць рэволюцыйныя ідэі, клапатліва працуюць для распаўсюджваньня марксыцка-ленінскіх ідэй.

Мясцовая група Асацыяцыі пролетаркіх рэволюцыйных пісьменьнікаў Нямеччыны лічыцца другой па сваёй велічыны (першая ў Бэрліне) і яна мае 20 членаў.

Акрамя гэтага ў Лейпцыгу існуе добрая група Асацыяцыі рэволюцыйных артыстаў. Абедзьве арганізацыі разам працуюць на культурным фронце.

Але агульны эканамічны крызіс ўва ўсім капіталістычным сьвеце вельмі востра адчуваецца на нашым жыцьцёвым становішчы. Рабочая кляса ў нас бяз грошай і нават пры добрым жаданьні ня можа купляць кніг. Многія пісьменьнікі павінны жыць грамадзкімі «благотворительными» дапамогамі (16 марак у тыдзень).

Мы, рэволюцыйныя пісьменьнікі ня толькі пісьменьнікі. Мы ў першую чаргу ўдзельнікі фронту змагаючагася пролетарыяту і амаль усе прымаем актыўны ўдзел у рэволюцыйнай барацьбе. Старшыня Лейпцыгскіх рэволюцыйных пісьменьнікаў працуе партыйным інструктарам і амаль бесперарыўна езьдзіць ад аднэй партыйнай мясцовай групы да другой, інструктуючы іх.

Некаторыя другія таварышы працуюць як рэдактары мясцовых комуністычных газэт і часопісаў.

Калі Вы зможаце скарыстаць артыкулы па літаратурных пытаньнях або малыя навелі і творы, мы з радасьцю прыслалі-б іх Вам.

Артыкулы на розныя політычныя тэмы ад нашых рабкораў. Мы дастаткова інфармаваны аб соцыялістычным будаўніцтве ў СССР, дзе пісьменьнікі маюць заданьне дапамагаць будаўніцтву соцыялізму. Пакуль што нашы задача разам працаваць. Мы спадзяемся, што ў самым недалёкім часе так сама будзем грамадзянамі вольнай Савецкай Нямеччыны, для таго, каб разам мець магчымасьць соцыялістычна спаборнічаць з Вамі ў пабудове новага жыцьця.

Вітаючы Вас, чырвоныя браты, ад імя мясцовай групы Лейпцыгскай Асоцыяцыі пролетарскіх рэволюцыйных пісьменьнікаў Нямеччыны.

Старшыня доктар ФЛАМО.

Сакратар Л. КРЫШЭ.

Мы раім Вам вывучаць інтэрнацыянальную дапаможную мову эспэранто, якая дае вялікую перавагу пролетарскай барацьбе на інтэрнацыянальным баявым фронце.

Д-р ФЛАМО.

Згодна пастановы Сакратарыяту МенАПП і бюро гаркома ЛКСМБ, пры Доме Пісьменьніка організоўваюцца двумесячныя курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў-організатараў фабрычна - заводзкіх літгурткоў.

Комсамольскім колектывам па дагаворанасьці з культсэктарамі заўкомаў,—вылучыць на гэтыя курсы лепшых ударнікаў, комсамольцаў.

Заявы на курсы прымаюцца ў Доме Пісьменьніка (Савецкая 68) да 20 мая г. г. Зварочвацца да т. Швэйдэля і Куніцкага.

Сакратарыят МенАПП.

Культпроп ГК ЛКСМБ.

Міхась Гартны

Эпіграмы

Янку Купалу

У шкапу за шклом «Жалейка» з «Шляхам»,
А побач змораны «Гусьляр»...
На іх глядзіць з-пад акуляр
Поэта сумны з нейкім жахам.
Прайшло-мінула шэраг год—
Здалёк напеўныя руляды...
Ён твор зьмяніў на пераклады,
А Юрку нават на факстрот.

І толькі прыдзе тое лета,
Як думкі шмыгаюць у сад,
Там лера дбайнага поэты
Бранчыць рыдлёўкай каля град.

Зьмітраку Бядулю

Язэп, зблудзіўшы ў цёмных крушнях,
Спаткаў пад кустам салаў'я,
І сябру мовіў прастадушна:
«Твая, брат, доля, як мая.
Двойм нам блутанай пуцінай
Прыйшлося шмат павандраваць.
Давай-жа песьняй лебядзінай
Былы наш посьпех апяваць».

Якубу Коласу

«Зямля» яго зусім ня тая—
Зьняслa яна па нівах межы...
І вось глядзіць на сьлед іх сьвежы
«Сымон-музыка», а ня грае.
Канцы схавалі «Шляхі волі»
Кудысьці ў цёмнае падпольле...
Адзін Прахор—стары праныра,
У колгасе нішчыць непаладкі,
Зьмяніўшы назву свайго кныра
На сьвіна-татку.

Міхасю Зарэцкаму

Яму раней вясна пяяла
І сьцежкі сонцам асьвятляла,
Ласкала бульканьнем руччоў...
Але дайшло да крывічоў,
Як раптам неба захмурыла
Вясну і сьцежкі падмачыла...
Сумуюць мокрыя кусты,
Да долу хілячы галоўкі...
І восень упарта на лісты
Наводзіць зьлёгку лякіроўку.

П. Гаўрыленка

Аб мастацка-масавым афармленьні

Соцыялістычная рэконструкцыя гарадоў, рэконструкцыя быта рабочых гораду, колгасьнікаў вёскі, якая праводзіцца на аснове посьпехаў ў соцыялістычным будаўніцтве патрабуе ад фронту мастацтва вялікае працы ў галіне новага пролетарскага афармленьня гарадоў, якія цяпер будуюцца, быту рабочых, вуліц, пляцаў, афармленьне рэволюцыйных сьвят, клюбаў, хат-чытален, дамоў адпачынку рабочых, выставак кніжок, плякатаў, тэатральных пастановак, насьценгазэт і інш. Усё гэтае зьяўляецца першачарговай задачай і патрабуе высока-ідэёвае і мастацкае работы.

Тут зразумела, у гэтай рабоце цяжка будзе працаваць саматужна, самая спэцыфіка работы патрабуе новых кваліфікаваных кадраў і адначасова колектыўных мэтодаў у рабоце.

Беларуская організацыя «Мастак» правяла значную работу ў справе паказу мастацкімі сродкамі нашых дасягненьняў, у організацыі працоўных на выкананьне плянаў соцыялістычнага будаўніцтва. Праведзена значная работа і па афармленьню. Афармленьне конфэрэнцыі Гаркому КП(б)Б, зьезду рабселькораў, будаўнічай выстаўкі ВСНГБ, 14 зьезду КП(б)Б, літаратурнай выстаўкі—паказалі актыўнасьць мастакоў, паказалі вялікі зрух ў павароце мастакоў да актуальнае тэматыкі сёнешняга дню.

Аднак, у справе афармленьня перад мастакамі БССР стаяць яшчэ вялікія задачы. Трэба разьбіць тыя варожыя нам думкі, якія глядзяць на справу афармленьня, як на халтурную справу, на якой можна добра зарабіць, для таго, каб далей займацца «чыстым мастацтвам», а такія думкі сярод рэакцыйнае часткі нашых мастакоў яшчэ ёсьць.

Практыка работы таварыства «Мастак» паказала, што праца па афармленьні патрабуе вялікай кваліфікацыі, кадраў мастакоў, зьвязаных у штодзённай рабоце з рабочымі, калгасьнікамі, і адыходу ад усялякіх індывідуалістычных праяў у рабоце, да пераходу на колектыўныя мэтоды работы. Праца брыгад дала лепшыя паказчыкі ў афармленьні плякатаў, дыяграм і інш., ня гледзячы на тое, што кожная мастацкая рэч выконвалася тым ці іншым мастаком паасобку.

Аднак, тыя дадатныя моманты у нашым колектыўным вопыце, якія мы мелі пры афармленьні выставак, ня былі скарыстаны і замацаваны ўсімі мастакамі, якія працавалі над афармленьнем 7-га зьезду Прафсаюзаў БССР, а былі выпадкі, калі па якасьці афармленьня ў параўнаньні з мінулай работай паказчыкамі былі значна ніжэйшымі.

Спробы некаторых мастакоў даць нешта прыдыёзнае (Эскіз афармленьня аддзелу Наркампрацы Ізмайлава і Кіпнера) не прывялі нікчому бо праца гэтых мастакоў была замкнутай, не абгаварывалася ў шырокім коле мастакоў, рабочых. Гэта паслужыла прычынай таму, што мастакі выхаласьцілі асноўнае, ідэёвае значэньне таго матэрыялу, які яны хацелі ў мастацкіх вобразах адлюстраваць.

Афармленьне такіх аддзелаў як Наркамзабясьпячэньне — Станкевіча, Наркампрацы—Алтуф'ева, не пазбаўлена трафарэтнасьці. Мастакі не падшукалі новых форм, а проста перанесьлі композіцыю з раней афармленых аддзелаў у гэты аддзел. Адсюль раздробленасьць форм, няўвязка экспонатаў паміж сабою і конструкцыяй. Адсутнасьць глыбока-ідэёвае арганізацыі матэрыялу.

Аддзел мэталістых, які афармляў мастак Бразэр, павінен быў стаць вядучым на выстаўцы, але з прычыны таго, што конструкцыя і тэматычна-ідэёва-вузкая, убогая пабудова гэтага аддзелу не змагла выявіць ідэі вядучасьці, а наадварот спрыяла заціраньню гэтага аддзелу. Упрыгожальныя часткі, (якія маюць падабенства да разгорнутай складчатай спадніцы), якія мастаком сконструяваны на заднім шчыце, перашкаджаюць толькі гледачу, залішне заграмаджаюць дыяграмны матэрыял.

Конструкцыя таварыша Гальбуртэ на якой паказаны аддзел рабочага тэатру, не дае нам спэцыфічных тэатральных рыс. Афарбоўка конструкцыі нагадвае афарбоўку былых каф'яранаў (канарэечны колер—жоўты і белы).

Многія мастакі, якія працавалі над афармленьнем дыяграм і плякатаў не пазбавіліся вышэй паказаных хібаў.

Некаторыя з іх афармляючы дыяграму ці плякат не цікавіліся тым, як дыяграма будзе ўвязана з іншымі экспонатамі, аддзела і конструкцыі. Частка дыяграм у аддзеле бібліятэк (брыгада мастака Ізмайлава) вылучаецца ад другіх сваёю халтурнасьцю, неперакананаўчасьцю. Плякат анты-клюбнага паходу—мастака Красоўскага і Давыдовіча поўны голага фармалізму, няма глыбока-ідэёвай насычанасьці.

Брыгада тав. Карпенкі больш-менш здавальняюча знайшла дэкарацыйныя монамэнтальныя формы афармленьня—фасад клюба харчавікоў, дому працы, трыбуна пляцу Волі.

Аднак трыбуна на пляцу Волі і плякат над памяшканьнем клюба харчавікоў мае значныя тэхнічныя недахопы — прыстасаванасьць, каляровая неўвязка.

Аддзел торфу на выстаўцы—сланцовай прамысловасьці таксама зьяўляецца паказальнай у параўнаньні з другімі аддзеламі на выстаўцы. Мастак Пашкевіч змог падпарадкаваць танальнасьць дыяграм афарбоўцы ўсяго аддзелу. А гэта спрые композыцыйнай ўвязцы, гармонічнасьці і адзінству, ўсіх экспанатаў аддзелаў.

Усе гэтыя недахопы, зрывы і ідэалёгічныя памылкі ў рабоце мастакоў па афармленьні яшчэ раз сыгналізуюць пра адставаньне выяўленчага мастацтва ад тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва. Усе гэтыя факты павінны мобілізаваць нас на выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) і Сакратарыяту ЦК КП(б)Б пра плякатна-масавую карціную работу.

Пытаньне пра плякат і пра мастацка-масавае афармленьне для мастака вельмі важная галіна працы.

Асноўныя задачы, задачы творчага парадку, якія стаяць у гэтай галіне—гэта змаганьне за высокую партыйна-палітычную ідэёвасьць, за тое, каб плякат быў войстрай зброяй ў руках рабочае клясы і комуністычнае партыі.

Адказны рэдактар Х. ДУНЕЦ
Выдае Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі
Друкарня імя Сталіна, Менск
Упаўнаважаны Галоўліту № А—668